Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СНЕЖНЯ 2021 г. СУБОТА № 245 (29614)

ВЯЛІКАЕ СЭРЦА ХІРУРГА 5

ЯК ПАЧУЦЬ МАСТАЦТВА 8

КАРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў касманаўта Алега Навіцкага ордэнам Дружбы народаў.

• Першы магазін адзення з цытатамі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адкрыецца сёння ў гандлёвым цэнтры «Замак». Першай сотні пакупнікоў абяцаюць прэзідэнцкі прэзент.

• Нацыянальная бібліятэка стварыла віртуальны рэсурс пра пісьменніка і крытыка Міхася Зарэцкага.

• Чырвоны Крыж суправодзіў амаль 7,6 тысячы пажылых вяскоўцаў і інвалідаў на вакцынацыю ад COVID.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ГЛАЗ, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі:

«Нагадваем еўрачыноўнікам, што каланіяльная эпоха скончылася і яны маюць права патрабаваць штосьці толькі ад сваіх краін-членаў. Таму ім не шкодзіла б заклапоціцца, каб запатрабаваць ад Польшчы, Літвы ці Латвіі спыніць жорсткія расправы над мігрантамі і забяспечыць доступ міжнародных арганізацый, грамадскасці і СМІ на граніцу. Роўна як і строгага захавання сваіх жа — еўрапейскіх — законаў і стандартаў. Яшчэ раз паўтараем свой заклік да ЕС перастаць генерыраваць напружанасць і пачаць вырашаць сумесныя праблемы ў нашым рэгіёне агульнымі намаганнямі шляхам узаемапаважлівага дыялогу».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАША СПРАВА — ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ НАРОД І ДЗЯРЖАВА ПАМЯТАЛІ ІХ»

Прэзідэнт Беларусі ўручыў Зоркі Герояў Беларусі сем'ям загінулых лётчыкаў

Таксама з рук кіраўніка краіны ордэн «За асабістую мужнасць» атрымалі родныя супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка.

За сучасную гісторыю нашай краіны званне Герой Беларусі ўручалі дагэтуль 11 раз. Апошняя такая ўрачыстая цырымонія праходзіла ў лютым 2014 года ў Палацы Незалежнасці з вялікай колькасцю гасцей, службовых асоб. Тады высокае званне атрымала сусветна вядомая спартсменка Дар'я Домрачава. Учарашняя цырымонія значна адрознівалася ад той. Яна была не менш урачыстая, але камерная, «дамашняя», шчымлівая, са слязамі на вачах. Ганаровыя ўзнагароды Прэзідэнт Беларусі ўручыў сем'ям мужных беларусаў пасмяротна.

Сем месяцаў прайшло з трагічнай гібелі Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Кукаленкі. У апошні шлях лётчыкаў праводзіў не толькі ўвесь горад — уся краіна. Такія трагічныя гісторыі заўсёды краналі сэрцы беларусаў: экіпаж ваеннага самалёта Лідскай штурмавой авіябазы падчас трэніровачнага палёту цаной свайго жыцця адвёў машыну ад жылых дамоў. Адмовіўшыся ад загаду катапультавацца і са словамі «Дапамажы, Госпадзі», лётчыкі накіравалі Як-130 у адзіную кропку, якая была па-за жылымі пабудовамі.

СТАР. 2

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка ўручае ўзнагароду сваякам лётчыка Андрэя Нічыпорчыка.

Моцны слабы пол

«Выбраць гэты шлях мне падказаў Бог...»

Ігумення Бабруйскага жаночага манастыра ў гонар Святых Жонак-Міраносіц — пра свой выбар, будаўніцтва храма і стаўленне да балета

Лёс ігуменні Параскевы звычайным не назавеш. У 18 гадоў яна, зусім яшчэ юная Наталля Ельская (яе імя ў міру), атрымлівае дыплом аб заканчэнні харэаграфічнага ліцэя і замест Кішынёўскага тэатра оперы і балета накіроўваецца ў Кіеўскі Свята-Пакроўскі манастыр. Жыццё мяняецца на 180 градусаў, маладая дзяўчына адмаўляецца ад кар'еры артысткі балета і прымае манаскі пострыг. А летась, пасля 23-гадовага служэння ў кіеўскім манастыры, едзе ў Беларусь працягваць будаўніцтва манастыра ў Бабруйску. Хто пасля гэтага скажа, што ў матушкі Параскевы не моцны характар?

СТАР. 9

Падчас святочнай літургіі ў дамавым храме.

Здароўе

ВАКЦЫНАВАЦЦА АД ГРЫПУ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

Яго выпадкі ўжо рэгіструюцца, а пік захваральнасці прагназуюць у студзені—лютым

Як паведамляе Міністэрства аховы здароўя, вынікі дазорнага эпідэміялагічнага сачэння за ВРІ і грыпам у Беларусі паказваюць: ідзе тэндэнцыя росту захворвання як па краіне ў цэлым, так і ў рэгіёнах. Найбольшы прырост захворвання адзначаецца ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях, а таксама ў Мінску. Хварэюць цяпер пераважна дзеці. Гэта азначае, што сезон грыпу распачаты? Паколькі летась гэта захворванне амаль не рэгістравалася, многія з нас забылі пра яго небяспеку і адмовіліся ад вакцынацыі. Але сёлета, гледзячы па ўсім, сітуацыя будзе іншая: і грып, і COVID-19 будуць суіснаваць разам, і пагроза заразіцца высокая, асабліва ў непрышчэпленых. У чым небяспека грыпу, асабліва для дзяцей? Ці не позна яшчэ прышчапіцца і ці паспее выпрацавацца імунітэт? Ці можна сумяшчаць прышчэпкі ад грыпу і COVID-19? І як адрозніць два гэтыя захворванні? Пра асаблівасці сёлетняга эпідсезона мы паразмаўлялі з загадчыкам супрацьэпідэмічнага аддзялення аддзела эпідэміялогіі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццянай ШВАЙКО.

СТАР. 11

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

«НАША СПРАВА — ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ НАРОД І ДЗЯРЖАВА ПАМЯТАЛІ ІХ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У канцы верасня яшчэ адна трагедыя скалыхнула краіну. Пры адпрацоўцы адрасоў у Мінску, дзе маглі знаходзіцца асобы, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці, быў смяротна паранены супрацоўнік праваахоўных органаў Дзмітрый Федасюк. За адвагу і мужнасць у пачатку месяца Прэзідэнт узнагародзіў байца ордэнам «За асабістую мужнасць». Пасмяротна...

На цырымонію ўручэння прыйшла амаль уся сям'я Андрэя Нічыпорчыка — жонка Анастасія, маці Галіна Міхайлаўна, бацька, палкоўнік запаса, Уладзімір Леанідавіч, сястра Алеся, 6-гадовы сын Аляксей. Усяго ў сям'і лётчыка трое дзяцей.

«Самаму малодшаму будзе толькі два гады. Ён, верагодна, асабліва не запомніў бацьку. Старэйшы сын і дачка ўспамінаюць, як з татам некуды хадзілі, дзе былі. Старэйшаму сыну мы тлумачылі, што тата не мог паступіць інакш, так сталася, што яны з Мікітам вырашылі ахвяраваць сваімі жыццямі дзеля іншых», — дзеліцца жонка Андрэя Нічыпорчыка Анастасія.

Асабліва сімвалічна ў дадзеных абставінах гучыць тлумачэнне родных маленькаму сыну на пытанне «Дзе тата?» — «Паляцеў на неба разам з Мікітам».

Менавіта дзеці, адзначае Анастасія, дапамагаюць трымацца і жыць далей: «Яны ўсе — працяг Андрэя, нашай любові, і гэта дае сілы».

Малодшы сын Аляксей асабліва рыхтаваўся да цырымоніі: думаў ехаць у Мінск у лётнай форме, якую падараваў бацька. Але абраў усё-такі афіцыйны касцюм. Як бацька і дзядуля ён марыць стаць лётчыкам. Анастасія кажа, што адгаворваць сына не будзе, выбар дасць яму.

Маці героя, Галіна Міхайлаўна, адзначае, што ўнук і знешне, і па характары — копія сына ў дзяцінстве. «На Лёшу кажуць — гэта Андрэйка». Яны вельмі падобныя, і Лёша вельмі хоча быць падобным на тату», — расказвае яна журналістам.

Фота Белта.

Сын Героя Беларусі Андрэя НІЧЫПОРЧЫКА Аляксей марыць стаць лётчыкам, як тата.

Жанчына ехала на цырымонію з хваляваннем: цяжка зноў перажываць тыя падзеі. «Мы вельмі ганарымся подзвігам свайго сына, але вельмі цяжка гэта зноў перажываць. Дзякуй Прэзідэнту, што ён справядліва ацаніў подзвіг нашых хлопчыкаў», — кажа Галіна Міхайлаўна праз слёзы.

Падзялілася сваімі ўспамінамі пра мужа і Анастасія: «Ён быў душой кампаніі, вясёлым, добрым. Ён сапраўдны мужчына, такіх, верагодна, больш няма, любячы бацька і выдатны муж».

З сям'і Мікіты Куканенкі на ўручэнне прыехалі жонка Таццяна, маці Наталля Алегаўна і 9-гадовая сястра Марыя.

Таццяна адзначае: толькі цяпер прыходзіць усведамленне, што муж больш ніколі вечарам не прыйдзе з работы. «Калі хлопцам далі Герояў, два пачуцці змяшаліся. Канечне, гонар, што іх учынак ацанілі. Але, як неяк ужо казала, медалі трэба насіць, а не класці на паліцу», — дзеліцца дзяўчына. Жанатыя яны былі толькі восем месяцаў, ведалі адзін аднаго з самага дзяцінства, а ўжо ў дарослыя гады зноў пачалі сябраваць.

Таццяна адзначае, што сябруе з жонкай Андрэя Нічыпорчыка Анастасіяй, і часта разам увечары яны сустракаюцца і ўспамінаюць сваіх мужчын. «Ён (Андрэй Нічыпорчык. — **«Зв.»**) быў нечым падобны да Мікіты, яны неяк дапаўнялі адзін аднаго», — заўважае жонка героя. Яна адзначае, што лётчыкі маглі катапультавацца з самалёта, але ці змаглі б жыць з гэтым? «Ведаючы свайго мужа, скажу: ён бы не змог дакладна. Так, гэта чалавечае жыццё, а таксама адданасць сваёй Радзіме. Такі ўчынак не кожны гатовы здзейсніць», — сцвярджае Таццяна.

Прэзідэнт Беларусі часта выступае з вялікімі прамовамі, але гэтым разам ён, пранікнуўшыся падзеяй, адзначыў: «Вельмі цяжка нешта казаць. Усё добрае ўжо сказана. Усё, што маглі, добрыя людзі ўжо пажадалі».

Аляксандр Лукашэнка падзяліўся: апошнім часам часта задумваецца, што сыходзіць вельмі многа сапраўдных патрыётаў нашай краіны. Ён згадаў смерць знакамітага дырыжора Міхаіла Фінберга і палітычнага дзеяча Вячаслава Кебіча. «Гэтыя людзі пражылі жыццё і пакінулі свой след у гісторыі нашай дзяржавы. Вашы хлопцы, пражыўшы вельмі кароткае жыццё, пакінулі вельмі яркі след у гісторыі нашай краіны, нашай дзяржавы. Дзякуй вам за сыноў, за вашых родных і блізкіх. Наша справа — зрабіць усё, каб народ і дзяржава памяталі іх. Паверце, так і будзе», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён назваў цырымонію выключнай, неверагоднай для сябе і падкрэсліў, што запрасіў сем'і ваенных, каб перадаць дзяржаўныя ўзнагароды іх родных, якія здзейснілі подзвіг.

* * *

У сучаснай гісторыі краіны ўжо ўручалася ўзнагарода Героя Беларусі пасмяротна за подзвіг лётчыку, нагадаў **Ігар ГОЛУБ, камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі.** Сёлета якраз 25 гадоў, як здзейсніў подзвіг Уладзімір Карват, таксама ў маі месяцы, таксама ў небе над Баранавічамі... Па яго словах, дзяржаўная камісія правяла поўнае расследаванне катастрофы, вывучыла ўсе матэрыялы, сродкі аб'ектыўнага кантролю, запісы перагавораў, сведчанні відавочцаў і дакументальна пацвердзіла, што лётчыкі здзейснілі гераічны ўчынак.

Ваенны адзначае, што фармат уручэння ўзнагарод выбраны вельмі правільны. «Да гэтага рыхтавацца цяжка. Я зараз размаўляў з сем'ямі — неабходна вытрымаць. Іх трохі адпускае. Аб'явілі пра ўказ — зноў нахлынула. Сем'ям вельмі цяжка. А Узброеныя Сілы ганарацца, што ў нашым страі, хоць і пасмяротна, ёсць яшчэ два Героі Беларусі», — сказаў Ігар Голуб.

Ён заўважае, што ваенныя заўсёды кіруюцца выразам з савецкага фільма «Афіцэры»: «Ёсць такая прафесія — Радзіму абараняць». А нядаўна, адзначае камандуючы, на экраны выйшаў расійскі фільм «Неба», і там ёсць выраз, які ён перафразаваў для сябе: «Мы не працуем на Беларусь. Мы служым Беларусі».

«І наш народ павінен быць упэўнены, маючы такі афіцэрскі корпус, як нашы загінулыя, мірная праца будзе абаронена, краіна будзе развівацца», — заўважае камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны.

Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ расказаў, што цырымонія ўзнагароджання з аднаго боку — знак пашаны і высокай ацэнкі подзвігу Дзмітрыя Федасюка, а з іншага — сумная падзея, бо ведамства страціла аднаго з найлепшых супрацоўнікаў.

«Ён неаднойчы ўдзельнічаў у самых складаных аперацыях па абязброенні злачынцаў. Фактычна ён закрыў сабой таварышаў, атрымаў смяротнае раненне, але да канца выканаў свой абавязак», — расказаў кіраўнік КДБ.

Ён падкрэсліў, што ведамства падтрымлівае сям'ю загінулага, а яго ўчынак — прыклад для ўсяго асабовага складу Камітэта дзяржаўнай бяспекі. «Дзіма заўсёды будзе ў нашых сэрцах, думках. Мы будзем імкнуцца быць годнымі яго ўчынку», — заявіў Іван Тэртэль.

Па яго словах, і простыя людзі, і супрацоўнікі сілавых структур пасля дзвюх трагедый аб'ядналіся і сталі больш абараняць інтарэсы Радзімы, арыентуючыся на гераічныя ўчынкі Андрэя Нічыпорчыка, Мікіты Куканенкі і Дзмітрыя Федасюка.

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

«МЫ ПАВІННЫ АКТЫВІЗАВАЦЬ ТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ З ЛЮДЗЬМІ»

Аб чым ішла размова на шостай сесіі Савета Рэспублікі

Сенатары абралі віцэ-спікера, падтрымалі на пасадзе старшыню ЦВК і абралі шэсць членаў Цэнтрвыбаркама. А Старшыня верхняй палаты парламента выказалася аб непрымальнай палітыцы калектыўнага Захаду, двайных стандартах, сумнеўных каштоўнасцях і рабоце, якую сенатарам неабходна праводзіць з насельніцтвам.

У прыватнасці, Наталля КАЧАНАВА згадала свой нядаўні візіт у ТЛЦ «Брэміна-Брузгі», дзе жывуць у спадзяванні трапіць у Еўрасаюз сотні бежанцаў з краін Блізкага Усходу. Яна звярнула ўвагу на тое, наколькі нават такія працэсы палітызаваны. «Жудасна! Чалавечае жыццё не каштуе нічога», — сказала яна і адзначыла, што за гэтым стаяць заходняя сістэма каштоўнасцяў і двайныя стандарты.

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла: каб захаваць нашу краіну, неабходна кожнаму на сваім месцы ўключыцца ў работу па абароне яе незалежнасці і суверэнітэту. Наталля Качанава нагадала падыходы, якімі кіруецца Аляксандр Лукашэнка: «Прэзідэнт прытрымліваецца абсалютна выразных і зразумелых для нас падыходаў. І трэба адказна працаваць на апераджэнне з людзьмі, тлумачачы ім, што стаіць за мірам і спакоем у нашай краіне.

Яна заклікала калег-сенатараў працаваць больш актыўна з насельніцтвам, сустракаючыся з працоўнымі калектывамі, падчас гутарак на прыёмах і гэтак далей. «Ведаю, што многія з вас гэта робяць, але цяпер трэба актывізаваць сваю дзейнасць па ўсіх напрамках. Дзе можаце, сустракайцеся з людзьмі, дзе можаце, кажыце, бо за гэтым будучыня нашай краіны і гэта не проста прыгожыя словы», — рэзюмавала яна.

* * *

На пасяджэнні шостай сесіі сенатары абралі новага віцэ-спікера верхняй палаты парламента. Ім стаў Леанід Заяц. Нагадаем, што 13 снежня рашэннем кіраўніка дзяржавы Анатоль Ісачанка быў прызначаны на пасаду старшыні Магілёўскага аблвыканкама. Паводле рэгламенту, яго паўнамоцтвы датэрмінова павінны быць спыненыя ў верхняй палаце парламента. Адпаведным указам Прэзідэнта былы старшыня аблвыканкама Леанід Заяц быў прызначаны членам Савета Рэспублікі.

Прадстаўляючы яго ў якасці кандыдата на вакантную пасаду віцэ-спікера, Наталля Качанава адзначыла, што Леанід Заяц шмат зрабіў на ніве выканаўчай улады, яго вопыт будзе прыдатны ў заканадаўчым рэчышчы. З просьбай падтрымаць яго кандыдатуру да членаў Савета Рэспублікі звярнуліся таксама старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы і сенатар, абраны ад Магілёўскай вобласці, Віктар Ананіч.

Падчас тайнага галасавання сенатары аднагалосна пагадзіліся з прапанаванай кандыдатурай.

* * *

Згодна з заканадаўчай працэдурай, сенатары таксама падтрымалі прызначанага кіраўніком краіны старшыню ЦВК Ігара Карпенку на пасадзе і абралі шэсць членаў Цэнтрвыбаркама.

Як адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ, даючы ацэнку кандыдатуры новага старшыні ЦВК, Ігар Карпенка — вядомы ў краіне чалавек, моцны, падрыхтаваны кіраўнік. Ён падкрэсліў, што Ігар Карпенка прадэманстраваў высокі прафесіяналізм, уменне знаходзіць найбольш эфектыўныя шляхі вырашэння пастаўленых задач. Ігар Луцкі выказаў упэўненасць, што спецыфіка дзейнасці Цэнтральнай выбарчай камісіі новаму старшыні вядомая, таму ён можа адразу ўвайсці ў працоўны выбарчы працэс: «Ігар Карпенка ўзначаліць Цэнтрвыбаркам у вельмі няпросты і адказны перыяд, бо ў самы бліжэйшы час трэба будзе арганізаваць рэспубліканскі рэферэндум па змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», — нагадаў Ігар Луцкі і выказаў меркаванне, што з гэтай і іншымі важнымі задачамі ўвесь абноўлены склад ЦВК пад кіраўніцтвам Ігара Карпенкі паспяхова справіцца.

Сенатары падтрымалі кандыдатуру Ігара Карпенкі аднагалосна.

21 снежня 2021 года завяршаецца тэрмін паўнамоцтваў членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, які абмежаваны пяццю гадамі. У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам абласныя выканаўчыя камітэты ў склад ЦВК рэкамендавалі наступныя кандыдатуры:

— ГУРЖЫЙ Андрэй Анатольевіч, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік аддзела арганізацыйна-метадычнай работы галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама;

— ДАРАШЭНКА Вольга Леанідаўна, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Магілёўскага аблвыканкама, начальнік аддзела прававога забеспячэння дзейнасці Магілёўскага аблвыканкама;

— ЛАСЯКІН Аляксандр Міхайлавіч, дырэктар Віцебскага дзяржаўна-тэхнічнага каледжа;

— КУНЦЭВІЧ Алена Канстанцінаўна, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Мінскага аблвыканкама;

— ТКАЧОЎ Аляксандр Генадзьевіч, намеснік генеральнага дырэктара па бяспецы, рэжыме і кадрах рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства вытворчага аб'яднання «Беларуснафта»;

— ФЕДАСЕНКА Кацярына Аляксандраўна, начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Гродзенскага аблвыканкама.

На тайным галасаванні члены Савета Рэспублікі аднагалосна пагадзіліся з прапанаванымі кандыдатурамі.

Вольга АНУФРЫЕВА.

БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ І ІНШЫЯ ПОМНІКІ

У Брэсце прайшло пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

У першы дзень работы камісіі парламентарыяў дзвюх краін павітаў **старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ**. Кіраўнік абласной прадстаўнічай улады коратка расказаў пра развіццё рэгіёна, асаблівую ўвагу засяродзіўшы на тых кірунках работы, якімі займаецца камісія.

Старшыня камісіі Алена АФАНАСЬЕВА падкрэсліла, што ўжо другое дзесяцігоддзе асаблівую ўвагу парламентарыі ўдзяляюць пытанням рэканструкцыі і развіцця мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»:

— Частка адпаведнай праграмы Саюзнай дзяржавы рэалізаваная, далейшае фінансаванне будзем трымаць на кантролі, — падкрэсліла старшыня камісіі.

Парламентарыі пабывалі ў крэпасці, азнаёміліся з вынікамі рэалізацыі праекта «Капітальны рамонт, рэстаўрацыя, музеефікацыя збудаванняў Брэсцкай крэпасці ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой». У другі дзень работы дэпутаты абмеркавалі ход работы па падрыхтоўцы новага праекта па далейшай сумеснай рабоце, накіраванай на захаванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і Расіі. Парламентарыі вызначыліся таксама з планам работы на наступны год.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Кантэкст

ПОЛЬСКІЯ СІЛАВІКІ ЗАБІВАЛІ НА ГРАНІЦЫ ВАЛАНЦЁРАЎ

Пра гэта расказаў вайсковец, які папрасіў палітычнага прытулку ў Беларусі

25-гадовы Эміль Чэчка збег, бо не вынес усяго таго, што робіцца на польскім баку граніцы.

«Паблізу беларуска-польскай граніцы на ўчастку пагранічнай заставы «Тушэмля» Гродзенскай пагранічнай групы беларускім пагранічным нарадам у пагранічнай паласе быў спынены ваеннаслужачы Узброеных сіл Польшчы Чэчка Эміль 1996 года нараджэння. Мужчына заявіў, што з'яўляецца ваеннаслужачым 16-й Паморскай механізаванай дывізіі імя караля Казіміра, часці якой былі перакінуты для забеспячэння аховы ўчастка граніцы з Беларуссю ў перыяд дзеяння надзвычайнага становішча на прыгранічных тэрыторыях Польшчы», — расказалі ў Дзяржпагранкамітэце. Там дадалі, што ў сувязі з нязгодай з палітыкай Польшчы адносна міграцыйнага крызісу і практыкай негуманнага абыходжання з бежанцамі вайсковец папрасіў палітычнага прытулку ў Беларусі.

Пасля Эміль Чэчка распавёў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» аб прычынах свайго ўчынку. «Я дэзерціраваў з арміі праз калючы дрот, парваў штаны, параніў руку, перабег праз нейтральную паласу і ўбачыў, што едзе польскі патруль. Я зняў форму і без адзення абходным шляхам пабег у бок Беларусі. Я вырашыў пакінуць польскую армію менавіта такім спосабам, таму што немагчыма маўчаць аб тым, што адбываецца на тэрыторыі Польшчы», — расказаў Эміль Чэчка.

Паводле яго слоў, ён не згодны з палітыкай сваёй дзяржавы. «Сядзеў каля агню, нічым не займаўся і думаў аб тым, што адбывалася ў гэтых лясах апошнія месяцы. Мы спачатку прыехалі, нам сказалі, што будзем стаяць каля пагранічных слупоў. У адзін момант пачалі прыязджаць да нас мужчыны з контрразведкі. Яны проста стаялі, часам толькі да каго-небудзь чапляліся, каб салдаты прывыкалі да таго, што да іх праяўляюць агрэсію. Калі салдат выходзіў некуды, яны правяралі дакументы без прычыны, гаварылі яму глупствы, хоць разумелі, што ён не можа нічога адказаць, — тыповая дэманстрацыя перавагі», — сказаў ваеннаслужачы.

«Я быў у такой сітуацыі, калі пад'язджаў які-небудзь валанцёр і пачынаў гаварыць: «Куды вы іх [бежанцаў] ведзяце?» А пагранічнік проста стрэліў яму ў лоб. Я бачыў як мінімум дзве такія сітуацыі», — паведаміў вайсковец.

«Пасля ўсяго, што яны зрабілі, каб ні адзін салдат не збег, яны паспрабуюць замяць гэту справу, зрабіць з мяне самага дрэннага чалавека, гаворачы, што я стваряю праблемы ў арміі або што наогул я загінуў. Гэта відавочна», — дадаў Эміль Чэчка.

Што, дарэчы, і распачалося. «У салдата, які знік учора, былі сур'ёзныя праблемы з законам, і ён падаў заяву аб звальненні з войска. Ён памылкова быў накіраваны на службу на граніцу. Я ўжо запатрабаваў тлумачэнняў, хто вінаваты», — заявіў міністр абароны Польшчы Марыуш Блашчак. Калі гэта насамрэч так, то ўзнікае шэраг пытанняў да кіраўніка абароннага ведамства. Калі інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці, то да Блашчака таксама шэраг пытанняў. Міністр сам сябе загнаў у кут.

Страта маральнасці — асноўнае паражэнне Польшчы ў міграцыйным крызісе. Такое меркаванне ў сваім тэлеграм-канале апублікаваў дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі палітычны аналітык Юрый Шаўцоў.

«Наконт польскага салдата, які збег у Беларусь. Хутка яго інтэрв'ю пойдуць у медыя. Але калі справа ў тым, што ён не вытрымаў удзелу ў «барацьбе» з нелегальнымі мігрантамі, то асабліва няма чаму здзіўляцца. Ён служыў якраз на тым напрамку, дзе ішоў і збольшага яшчэ ідзе асноўны паток пераходаў праз граніцу. Калі адштурхоўвацца ад ацэначнай лічбы ў 250 загінулых на польскай граніцы, то на гэты напрамак павінна прыйсціся 150—200 загінулых. 200 чалавек называе ў адным інтэрв'ю і мэр мясцовага гарадка», — адзначыў эксперт.

Паводле яго слоў, у Польшчы дастаткова моцна развіўся грамадскі рух у дапамогу бежанцам. «У асноўным гэта вельмі паслядоўныя каталікі і лібералы, якія супрацьстаяць адзін аднаму па іншых тэмах. На сілавым сектары гэтая сітуацыя ў нейкі момант павінна адбіцца абавязкова. Страта польскай знешняй палітыкай маральнасці — гэта ўвогуле асноўнае паражэнне Польшчы ў міграцыйным крызісе. Засталіся ў Польшчы ў ідэалогіі знешняй палітыкі голы нацыяналізм і геапалітычны інтарэс», — перакананы Юрый Шаўцоў.

Пракаментаваў інфармацыю ў сваім тэлеграм-канале і палітычны аналітык Аляксандр Шпакоўскі.

• Тым часам

Для развіцця дыялогу па міжнародным ваенным супрацоўніцтве першы намеснік начальніка Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Міністэрства абароны палкоўнік Валерый Равенка правёў сустрэчы з ваеннымі аташэ Кітайскай Народнай Рэспублікі, Азербайджана, Чэхіі, Венгрыі і Польшчы. Аб гэтым паведамілі ў Мінабароны.

Асноўнай тэмай была напружанасць на Дзяржаўнай граніцы Беларусі. «Указана на неканструктыўнасць існуючых адносін з боку асобных краін пояса добрасуседства і аднабакасць падачы з іх боку інфармацыі, у тым ліку ў дыпламатычных установах на тэрыторыі іншых краін, — расказалі ў Мінабароны. — Указана, што пазіцыя адмовы ад дыялогу і мерапрыемстваў кантролю над узбраеннямі не садзейнічае ўстанаўленню добрасуседскіх адносін».

Як зазначаецца, асобна польскаму дыпламату ўказалі на непрымальнасць ультыматыўных заяў і прапанавалі правесці прыгранічныя перагаворы з польскім ваенным ведамствам, дзе будуць абмеркаваны пытанні, якія кожны з бакоў лічыць крытычнымі. Акрамя таго, прапанавана неадкладна правесці адначасовыя верыфікацыйныя мерапрыемствы на тэрыторыі як Польшчы, так і Беларусі ў рамках рэгіянальных мер даверу і бяспекі, нягледзячы на эпідэміялагічныя і іншыя абмежаванні. Прадугледжваецца, што гэтыя крокі дадуць магчымасць не толькі зняць напружанасць у адносінах, але і дадуць старт канструктыўнаму дыялогу і наладжванню адносін.

«Вось ужо і перабежчыкі пайшлі. Хутка з'явяцца таксама «вяртанцы», якія будуць выкрываць «збеглых» і іх куратараў», — адзначыў эксперт. З'явілася і першая рэакцыя ад палітыкаў Польшчы. Так, польскі еўрадэпутат ад партыі «Грамадзянская кааліцыя» Дарыуш Расаці на сваёй старонцы ў Twitter напісаў: «Крызіс на польска-беларускай граніцы. Польскі салдат папрасіў прытулку ў Беларусі. Беларусь з'яўляецца бастыёнам свабоды ў параўнанні з Польшчай і кіруючай партыяй «Права і справядлівасць».

Пётр ДУНЬКО.

Дзеля памяці

ВЯЛІКІ ЖЫЦЦЯЛЮБ І АПТЫМІСТ

Памёр Герой Савецкага Саюза Васіль Мічурын

Летам ветэран Вялікай Айчыннай вайны адзначыў свой 105-ы дзень нараджэння. Нягледзячы на тое, што віншавалі Васіля Сяргеевіча ў доме-інтэрнаце, дзе ён знаходзіўся на рэабілітацыі пасля паспяхова перанесенай аперацыі, настрой у Героя Савецкага Саюза заставаўся не па ўзросце бадзёры. Васіль Мічурын быў вельмі рады атрымаць ад начальніка Генштаба віншавальнае пасланне кіраўніка дзяржавы, кветкі і падарункі. «Я жыву і жыць хочацца!» — казаў падчас той сустрэчы Герой.

Зорку Героя Васіль Мічурын атрымаў у 24 гады! Яшчэ на Савецка-фінляндскай вайне. Аб такой высокай узнагародзе даведаўся ад сваіх таварышаў. Вушам сваім не паверыў: героямі тады толькі лётчыкі станавіліся, а тут на табе — кулямётчыку пашанцавала!

«Пайшоў з жыцця чалавек вялікай асабістай мужнасці, нязломнай стойкасці, сапраўдны патрыёт сваёй Айчыны. Васіль Сяргеевіч — яркі прадстаўнік пакалення герояў-пераможцаў. Яго жыццё — прыклад самаахвярнага служэння сваёй краіне і народу, вернасці высокім грамадзянскім каштоўнасцям і ідэалам, маральным прынцыпам», — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў родным і блізкім Героя Савецкага Саюза Васіля Мічурына.

Вось што расказваў мне Васіль Сяргеевіч аб тым, што ў свой час назвалі подзвігам: «А было ўсё так. Марозным лютаўскім днём 1940 года. Я быў тады кулямётчыкам 271-га мотастралковага палка 17-мотастралковай дывізіі Паўночна-Заходняга фронту. Мы атрымалі загад аб наступленні. Падчас бою камандзір узвода быў смяротна паранены. Прыйшлося браць ініцыятыву ў свае рукі. 15 кулямётчыкаў да апошніх сіл змагаліся з ворагам. У жывых застаўся толькі я і падносчык патронаў Каралёў. Абарона працаўніка на рацэ Пінус-Ёкі, што каля вёскі Мэра (зараз Выбаргскі раён Ленінградскай вобласці), была паспяхова прарвана...» Так, лічы ў адзіночку, Васіль Мічурын даваў адпор ворагу.

Нягледзячы на такую высокую ўзнагароду, у Вялікую Айчынную ён быў звычайным салдатам. Прайшоў усю вайну: пачынаючы з абароны Мінска, заканчваючы штурмам Берліна. Але ўсё скончылася для яго толькі 13 мая 1945 года пад Прагай. Пасля вайны Герой Савецкага Саюза служыў у Брэсце. Ужо тады для яго, рускай па нацыянальнасці, стала зразумелым, што ён назаўжды звязаны з Беларуссю. Так і атрымалася. Хоць і служыў некаторы час у групе савецкіх войскаў у Германіі, шляхі-дарогі ўсё роўна вялі Васіля Мічурына ў нашу краіну, якая стала для яго другой радзімай.

На працягу многіх гадоў Герой Савецкага Саюза з'яўляўся актыўным удзельнікам шматлікіх грамадскіх і ветэранскіх арганізацый. Нягледзячы на паважаны ўзрост, палкоўніка ў адстаўцы часта можна ўбачыць на розных мерапрыемствах і на вечаровых шпацырах. Асабліва любіў сустракацца з моладдзю. Яго вясёлых ваенных гісторый, мудрых жыццёвых парад будзе не хапаць многім пакаленням беларусаў. Вечная памяць!

Вераніка КАНЮТА, фота з адкрытых крыніц.

Перадсвяточнае

Каб дзеці былі шчаслівыя

Першы этап абласной ёлкі Брэстчыны прайшоў у Белавежскай пушчы

Сёлета ўпершыню галоўная ёлка Брэсцкай вобласці з удзелам кіраўніка рэгіёна праходзіць у два этапы. Першы этап адбыўся ў рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы 17 снежня, другі пройдзе ў абласным Цэнтры маладзёжнай творчасці 29 снежня.

У Белавежскую пушчу прыехала больш за 250 хлопчыкаў і дзяўчынак — таксама актыўныя і крэатыўныя, былі дзеці і са шматдзетных сем'яў, сіроты. Разам яны весела вадзілі карагоды, удзельнічалі ва ўсіх забаўлянках, размаўлялі з пушчанскім Дзедам і яго ўнучкай Снягуркай. Казачныя героі-экскурсаводы знаёмілі гасцей з рэзідэнцыяй, дзятва ўдзельнічала ў інтэрактыве «12 месяцаў», з цікавасцю аглядалі вучні дзедаву «Скарбніцу». Многія з іх упершыню аказаліся ў рэзідэнцыі беларускага навагодняга чараўніка. І гэта наведванне стала для іх, вядома ж, падарункам. Акрамя таго, усе ўдзельнікі свята атрымалі падарункі ад губернатара.

Хлопчыкаў і дзяўчынак цёпла павіншаваў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА**. Губернатар адзначыў, што ёлка арганізавана ў пушчы для таго, каб малыя з самых аддаленых раёнаў змаглі пабываць у казачнай рэзідэнцыі. «Наша задача — зрабіць усё, каб дзеці адчулі сябе шчаслівымі», — сказаў Юрый Шулейка.

Дзед Мароз таксама пажадаў усім гасцям здароўя і шчасця.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота Валерыя КАРАЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Тэрактаў пабольшала

Колькасць розных тэрарыстычных вылазак у свеце павялічылася ў мінулым годзе на 15 працэнтаў. Такія даныя прыводзяцца ў чарговым штогадовым дакладзе Дзярждэпартамента аб барацьбе з тэрарызмам. Як удакладняецца ў гэтым даследаванні, летась амерыканскі ўрад зафіксаваў 10 172 інцыдэнты тэрарыстычнай накіраванасці ў розных краінах. Гэтыя вылазкі забралі жыцці 29 389 чалавек. Пры гэтым раненні атрымалі 19 413 чалавек, а яшчэ 4471 быў выкрадзены. Як адзначае знешнепалітычнае ведамства ЗША, усплёск тэрарыстычнай дзейнасці таксама прывёў да павелічэння на 12 % (у параўнанні з 2019 годам) колькасці загінулых. Згодна з высновамі Дзярждэпартамента, у значнай ступені азначаныя тэндэнцыі тлумачацца «111-працэнтным ростам колькасці інцыдэнтаў у Емене і суседняй Саудаўскай Аравіі», а таксама актывізацыяй баевікоў у Афрыцы, асабліва ў зоне Сахеля, Мазамбіка і Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга.

У Осацы пры пажары ў офісным будынку загінула больш чым 20 чалавек

Колькасць ахвяр пажару ў будынку ў японскім горадзе Осака склала як мінімум 24 чалавекі, паведаміў тэлеканал NHK са спасылкай на мясцовую паліцыю. Усе яны загінулі ад атручэння чадным газам. Узгаранне адбылося ў васьміпавярховым будынку на чацвёртым паверсе, дзе знаходзілася клініка па аказанні тэрапеўтычнай і псіхалагічнай дапамогі. Сам будынак знаходзіцца ў ажыўленым квартале недалёка ад галоўнага чыгуначнага вакзала горада. Адразу пасля ўзгарання на месца здарэння прыбыла больш чым 30 пажарных разлікаў. На працягу паўгадзіны агонь патушылі. «Паліцыя Осакі расследуе пажар як магчымы падпал», — адзначыў губернатар рэгіёна Хірафумі Ёшымура ў «Твітэры». Па звестках тэлеканала NHK, які спасылаецца на крыніцы, блізкія да расследавання, перад пажарам у прыёмную клінікі зайшоў мужчына ва ўзросце каля 60 гадоў. У яго ў руках была сумка, з якой на падлогу капала нейкая вадкасць.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 15 (114)

Каштоўнасці

Абараняць Радзіму — гэта па-хрысціянску

«Узаемадзеянне сілавых структур і праваслаўнай царквы ўплывае на маральны клімат у воінскіх калектывах»

Так лічыць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, які прыняў удзел у круглым стале «Беларуская праваслаўная царква — Узброеныя Сілы і іншыя воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь: аспекты ўзаемадзеяння і перспектывы развіцця», які днямі адбыўся ў Цэнтральным доме афіцэраў. Прадстаўнікі духавенства і сілавых структур краіны абмеркавалі пытанні ўдасканалення ўзаемадзеяння Узброеных Сіл і іншых воінскіх фарміраванняў з Беларускай праваслаўнай царквой, а таксама аспекты духоўна-маральнага выхавання ў кантэксце сучасных выклікаў і пагроз.

Кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы паведаміў, што ў наступным годзе будзе адзначацца 30-годдзе супрацоўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы з сілавымі структурамі краіны. «Векавая гісторыя Беларусі сведчыць, што праваслаўе заўсёды з'яўлялася духоўнай асновай менталітэту беларускага народа, хрысталюбівага воінства абаронцаў Айчыны, — заўважыў мітрапаліт Веніямін. — Зварот воінства да духоўных хрысціянскіх ісцін і патрыятычных каштоўнасцяў за ўсе гэтыя гады знаходзіў і знаходзіць разуменне і падтрымку з боку Міністэрства абароны і іншых сілавых структур. Гэта стала дзейсным стымулам да развіцця нашага ўзаемадзеяння, якое будуецца на прынцыпах выканання заканадаўства Беларусі, павагі права ваеннаслужачых на свабоду сумлення, уліку асаблівасцяў воінскай службы, павагі канфесійнай і ваенна-прафесійнай культуры, традыцыях праваслаўнай царквы і органаў сістэмы забеспячэння бяспекі».

Фота «Звязды».

— Сацыялагічныя даследаванні пацвярджаюць, што Узброеныя Сілы і рэлігійныя канфесіі — тыя дзяржаўныя інстытуты, якія маюць вельмі высокі ўзровень даверу ў нашых грамадзян, — заявіў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** — Людзям у пагонах, членам іх сем'яў таксама важная духоўная падтрымка ў гэты вельмі няпросты час. Неабходным з'яўляецца і фарміраванне маральнай матывацыі да воінскай службы. Цяпер дастаткова часта даводзіцца чуць, што многія маладыя людзі не разглядаюць для сябе магчымасць служыць ва Узброеных Сілах. Каб малады чалавек усвядоміў важнасць воінскага абавязку, неабходны ўдзел у гэтым і святароў. Абараняць сваю Радзіму — хрысціянская традыцыя. У цяперашні час, калі ў свеце існуе шмат ваенна-палітычных пагроз, вельмі важна, каб кожны чалавек, грамадзянін нашай краіны разумеў, што ёсць такі абавязак — абараняць Радзіму.

Па словах **памочніка міністра абароны па ідэалагічнай рабоце — начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёра Леаніда КАСІНСКАГА**, праваслаўная царква заўсёды была правадніком хрысціянскіх і агульначалавечых каштоўнасцяў, якія маюць ключавое значэнне ў воінскай дзейнасці і ваенным супрацьборстве. «Сёння ў шэрагу краін на еўрапейскім кантыненце адбываецца разбурэнне сістэмы традыцыйных маральных каштоўнасцяў, — акцэнтаваў увагу прадстаўнік абароннага ведамства. — Беларусь знаходзіцца ў адкрытай інфармацыйнай прасторы, і ўсе мы сутыкаемся з комплексам праблем, звязаных з уздзеяннем на свядомасць людзей. Гэта адлюстроўваецца, у прыватнасці, на прызыўным кантынгенце. Перш за ўсё, адзначаюцца прагматызацыя свядомасці і папулярызацыя ідэй спажывецкага грамадства. Ідзе размыванне ў грамадскай свядомасці такой фундаментальнай каштоўнасці, як патрыятызм, зніжэнне гатоўнасці грамадзян да абароны незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, суверэнітэту і канстытуцыйнага строю Рэспублікі Беларусь».

Вераніка КАНЮТА.

Баяздольнасць

СЛУЖБА З АКЦЭНТАМ НА ІНТЭЛЕКТ

Тэхніка і ўзбраенне радыёэлектроннай барацьбы айчыннай вытворчасці адпавядае найлепшым сусветным стандартам

ВОПЫТ апошніх войнаў і ўзброеных канфліктаў паказаў, што радыёэлектронная барацьба — неад'емная частка шматлікіх аперацый і баявых дзеянняў самых розных маштабаў. Без радыёэлектронных сродкаў нельга ўявіць і мірнае жыццё. Дзякуючы ім, мы сёння можам абменьвацца інфармацыяй на любых адлегласцях, а таксама ў розных умовах. Як сёння развіваюцца сродкі радыёэлектроннай барацьбы і чаму без іх немагчыма ўявіць сучасную армію, расказаў начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Ігар ДАНІЛЬЧЫК.

— Ігар Іванавіч, у ваенна-палітычным плане год быў напружаны. Як ён прайшоў для вашых войскаў?

— Год мы завяршаем з добрымі вынікамі. Напярэдадні вялікіх асенніх манеўраў «Захад-2021» правялі сумеснае спецыяльнае вучэнне разам з расійскімі калегамі. Прычым яно выпала на той перыяд, калі мы перажывалі спёку, неўласцівую для нашай краіны. Гэта дало магчымасць выпрабаваць усю нашу новую тэхніку ва ўмовах кліматычных перападаў. Немагчыма было знаходзіцца ў машынах старога парку, людзі працавалі на знос. Вытрымалі ўсе, нават нашы далікатныя дзяўчаты, якія ў такіх складаных умовах выканалі свае задачы на «выдатна». З новай тэхнікай, забяспечанай клімат-кантролем, працаваць больш камфортна: тэмпература, выстаўленая аператарам, падтрымліваецца ў любых умовах. Выпрабавалі тэхніку на стрэсаўстойлівасць, праверылі яе функцыянальнае прызначэнне. Яшчэ раз пераканаліся ў тым, што разам з Ваенна-прамысловым камітэтам мы стварылі годную тэхніку, якая мае ўжо сваё імя ў свеце, нам не сорамна, што ў нашых руках узбраенне, якое адпавядае найлепшым сусветным стандартам. І самае галоўнае, што гэтую найскладанейшую тэхніку мы ўмеем эксплуатаваць. Калі б не было навучаных экіпажаў, гэта ўсё пераўтварылася б у груду жалеза.

— Спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы называюць «інтэлектам» беларускай арміі: высокаадукаваныя ваеннаслужачыя ў любы момант здольныя выявіць радыёперашкоду або, наадварот, стварыць яе, каб дэзарыентаваць праціўніка. Хто сёння папаўняе шэрагі высокаінтэлектуалаў?

— Сёлета ў сувязі з пераходам з чатырохгадовага на пяцігадовае навучанне ў Ваеннай акадэміі быў двайны выпуск, таму афіцэраў мы атрымалі больш, чым звычайна. Акрамя таго, традыцыйна прызываем у свае войскі хлопцаў, якія скончылі ваенную кафедру грамадзянскіх ВНУ, у прыватнасці БДУІРа. Прыходзяць да нас і афіцэры, якія, адслужыўшы патрэбны тэрмін, застаюцца ў арміі. Галоўнае, каб у чалавека было жаданне вывучаць новае, павышаць сваю кваліфікацыю і ўвесь час удасканальвацца. Калі ж спецыяліст дасягнуў пэўнага ўзроўню і лічыць, што яму гэтых ведаў дастаткова, у нас яму не месца. Тэхніка і тэхналогіі настолькі імклівa развіваюцца, што калі застацца на папярэднім узроўні, то далёка наперад не пойдзеш.

«Неабходна навесці парадак у карыстанні беспілотнымі лятальнымі апаратамі, асабліва ў побытавай дзейнасці».

— Якімі апошнімі навінкамі, што паступілі на ўзбраенне ў войскі радыёэлектроннай барацьбы, можаце пахваліцца?

— Раней, калі магчымасці навукі і прамысловасці былі не такімі шырокімі, як цяпер, і мікраэлектроніка з'яўлялася менш развітой, нашы ўзоры тэхнікі РЭБ мелі даволі вузканакіраваную спецыялізацыю. Калі ўзяць увесь дыяпазон ультракароткіх хваляў (ад 30 да трох тысяч мегагерц), то ў гэтым дыяпазоне ў нас было некалькі відаў тэхнікі. Цяпер жа ёсць тэхніка, якая дазваляе закрыць цалкам увесь дыяпазон ультракароткіх хваляў і нават вышэй (да шасці тысяч мегагерц) — і гэта ўсё адным узорам, які валодае магчымасцямі мінімум роты радыёперашкод старога парку. Дзве машыны, якія працуюць у адной звязцы, па факце могуць працаваць як асобны батальён. Той жа комплекс «Удар-АСП» закрывае ўсе нашы жаданні і здольны супрацьстаяць любым сучасным відам сувязі. Але мы не расслабляемся, бо сродкі сувязі ў віртуальнага праціўніка таксама ўдасканальваюцца. На ўзбраенне паступіла новая тэхніка, якая разлічана на сродкі мабільнай сувязі, паколькі гэта адзін з асноўных відаў сувязі, у тым ліку на полі бою. Ёю карыстаюцца ўсе, таму мы павінны ўлічваць гэты момант і думаць, як супрацьдзейнічаць. Вясной чакаем паступленне на ўзбраенне вопытна-канструктарскай распрацоўкі «Кветка» айчыннай вытворчасці, якая дазволіць нам атрымаць новы магутны комплекс перашкод у галіне кароткахвалевай радыёсувязі.

«Тэхніка і тэхналогіі настолькі імклівa развіваюцца, што калі застацца на папярэднім узроўні, то далёка наперад не пойдзеш».

— Парушальнікамі электрамагнітнага асяроддзя часта з'яўляюцца беспілотныя лятальныя апараты...

— Тут праблема ляжыць у заканадаўчай плоскасці: неабходна навесці парадак у карыстанні беспілотнымі лятальнымі апаратамі, асабліва ў побытавай дзейнасці. Справа ў тым, што квадракоптары цяпер можна купіць у любой краме цацак. Таму, каб зламыснік не меў прастага доступу займець гэты апарат, карыстанне беспілотнікамі трэба пакласці ў законнае юрыдычнае рэчышча. Праўда, большасць усё ж такі набывае беспілотныя лятальныя апараты для таго, каб зрабіць сваё жыццё найцікавейшым, аднак гэта ніякім чынам не павінна перашкаджаць працы дзяржаўных органаў і сілавых структур. У плане сілавых уздзеянняў, за што мы, рэбаўцы, адказваем, у нас ёсць тэхніка, здольная ажыццяўляць супрацьдзеянне любым беспілотным лятальным апаратам. Сур'ёзныя лятальныя апараты-парушальнікі трапяць пад уздзеянне не толькі сродкаў радыёэлектроннай барацьбы, але і сродкаў супрацьпаветранай абароны. Асноўная праблема — выяўленне лятальных апаратаў малога класа. Яны маюць вельмі малую эфектыўна адлюстроўваемую паверхню і для сродкаў супрацьпаветранай абароны з-за сваіх габарытаў могуць з'яўляцца невідзімкамі. У гэтым выпадку большая надзея на сродкі радыёэлектроннай барацьбы, якія дазволяць іх выявіць, а далей прыняць рашэнне па спыненні дзеянняў — у нас ёсць сучасныя сродкі радыёэлектроннай барацьбы, якія дазваляюць гэта рабіць. Акрамя таго, у нашых інтарэсах вядзецца вопытна-канструктарская распрацоўка «Эгіда», якая дазволіць выконваць вузкаспецыялізаваную задачу па падаўленні шматлікіх дронаў нана-, мікра-, міні-класа.

— Наколькі карысны міжнародны вопыт у развіцці войскаў радыёэлектроннай барацьбы?

— У нас добрае ўзаемадзеянне налажана з калегамі з Расійскай Федэрацыі. Яны маюць баявы вопыт, якім ахвотна з намі дзеляцца. Акрамя таго, сочым за тымі тэндэнцыямі ў развіцці РЭБ, якія назіраюцца ў нашых партнёраў. Аднак не думаю, што ў гэтым плане мы ў чымсьці ім саступаем. Беларусь у развіцці сродкаў радыёэлектроннай барацьбы знаходзіцца ў сусветным трэндзе. Наша тэхніка карыстаецца попытам на міжнародным арэне. У прыватнасці, узбраенне, якое ствараецца прадпрыемствам «КБ Радар», станцыі перашкод «Граза», актыўна прадаецца на блізкаўсходнім рынку і ў іншых рэгіёнах, пры гэтым яны выйгралі жорсткую канкурэнтную барацьбу з сусветнымі вытворцамі еўрапейскіх і амерыканскіх краін.

Вераніка КАНЮТА.

Кампетэнтна

Перыяд «адлігі» скончыўся

Генерал-маёр Алег ВОІНАЎ, начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва:

— У 2020 годзе чарговы перыяд «адлігі» ў адносінах паміж нашай дзяржавай і калектыўным Захадам скончыўся. Суседнія краіны сталі яшчэ больш інтэнсіўна нарошчваць кантынгенты ў непасрэднай блізкасці ад Рэспублікі Беларусь і ўжо напрамую называюць нашу дзяржаву, а не толькі Расію, у якасці крыніцы пагроз.

У сітуацыі, якая склалася, як ніколі выразна мы бачым неабходнасць захавання дамоўленасцяў у сферы кантролю над узбраеннямі і перш за ўсё ў адносінах да суседніх дзяржаў: іншых варыянтаў супрацоўніцтва проста не засталося. Характэрна, што разуменне таго, што акно для дыялогу павінна захоўвацца, ёсць і ў НАТА. Нягледзячы на згортванне практычных мерапрыемстваў супрацоўніцтва з намі, альянс заявіў аб магчымасці захавання ўзаемадзеяння па пытаннях, якія датычацца кантролю над узбраеннямі, мер умацавання даверу і бяспекі. Але, як аказалася, не ўсе дзяржавы — члены НАТА гатовы ісці далей заяў, сфармуляваных кіраўніцтвам гэтага ваенна-палітычнага блоку.

З канца кастрычніка 2021 года Рэспубліка Польшча працягвае нарошчваць колькасць вайскоўцаў, размешчаных на беларуска-польскай граніцы. Па афіцыйных даных польскага боку, у цяперашні час каля нашай граніцы засяроджана не менш чым 15 тысяч ваенна-служачых Войска Польскага (гэта без уліку асабовага складу іншых сілавых ведамстваў). Польскі бок неаднаразова быў праінфармаваны аб тым, што размяшчэнне такога значнага кантынгенту ўздоўж беларуска-польскай граніцы выклікае ў нас глыбокую заклапочанасць і патрабуе, на нашу думку, дзеянняў у адпаведнасці з Венскім дакументам 2011 года і Наборам дадатковых да Венскага дакумента 1999 года мер па ўмацаванні даверу і бяспекі, прынятых Беларуссю і Польшчай у 2004 годзе.

Міністэрства абароны Беларусі прапаноўвала польскаму боку запрасіць нашых прадстаўнікоў для назірання за ваеннай дзейнасцю ў прыгранічным раёне ў адпаведнасці з палажэннямі Набору дадатковых мер. Іншым варыянтам магло быць наведванне беларускімі прадстаўнікамі раёнаў на польскай тэрыторыі, у адносінах да якіх існуюць падставы для заклапочанасцяў. Польскаму боку таксама неаднаразова прапаноўвалася правесці двухбаковую рабочую сустрэчу па лініі верыфікацыйных органаў з мэтай удакладнення шэрагу пытанняў, якія датычацца нарошчвання польскага кантынгенту на граніцы з Рэспублікай Беларусь, і выпрацоўкі парадку далейшай сумеснай работы, накіраванай на зніжэнне ўзроўню напружанасці. На жаль, польскія калегі працягваюць настойваць, што практычна два дзясяткі тысяч вайскоўцаў разам з сур'ёзнай ваеннай тэхнікай не ажыццяўляюць ніякай ваеннай дзейнасці, а знаходзяцца каля нашых граніц толькі з мэтай аказання супрацьдзеяння мігрантам, якія спрабуюць трапіць у Заходнюю Еўропу ў пошуках лепшага жыцця.

Не менш непакоіць і сітуацыя на паўднёвым напрамку. Некалі шчыльныя ваенныя кантакты з Украінай з 2014 года фактычна пастаўлены на паўзу. І зноў не з нашай ініцыятывы. Неаднойчы нам даводзілася звяртацца да ўкраінскага боку і па тлумачэнні ў сувязі з інфармацыяй, якая з'яўлялася ў СМІ, аб мерапрыемствах баявой падрыхтоўкі, аб фарміраванні новай воінскай часці ў зоне прымянення мер даверу і бяспекі. Ва ўмовах фактычнага спынення двухбаковых кантактаў па ваеннай лініі фіксуюцца неаднаразовыя парушэнні ўкраінскім бокам Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь у паветранай прасторы. Да задач беларускіх Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны адносіцца недапушчэнне беспакаранага парушэння парадку выкарыстання паветранай прасторы любымі лятальнымі апаратамі, незалежна ад іх дзяржаўнай або ведамаснай прыналежнасці. Мы не паддаёмся на правакацыі, але папярэдзілі суседнія дзяржавы, што ў выпадку далейшых падобных супрацьпраўных дзеянняў у адносінах да нашай краіны гатовы дзейнічаць рашуча і жорстка.

Суседзяў не выбіраюць. З суседзямі заўсёды найбольш блізкія гістарычныя, эканамічныя і культурныя сувязі. Ды і знайсці агульную мову ў прамым і пераносным сэнсе заўсёды прасцей. Хацелася б сказаць нашым суседзям: мы ў вас назаўжды. Давайце разам рабіць наш рэгіён стабільным і спакойным. Трэба толькі захацець і пачаць, дакладней, працягнуць. Беларусь настроена на сяброўства і ўзаемапавагу. Настроена на мір!

Вераніка КАНЮТА.

Людзі і лёсы

Залатыя рукі і вялікае сэрца Мікалая Абрамава

Ваенны ўрач, які выратаваў жыццё вядомаму паралімпійцу Аляксею Талаю, — пра свой шлях у медыцыну і дзяцей, якіх выцягнуў з таго свету

«Мікалай Аляксеевіч змагаўся за маё жыццё як мог. І дзякуй богу, што ў яго хапіла на гэта сіл і прафесіяналізму. Ён мне казаў, што гэта цуд, што я жыву. І сам жа гэты цуд і зрабіў», — распавядае Аляксей Талай, адзін з самых вядомых пацыентаў Мікалая Абрамава — хірурга, палкоўніка медыцынскай службы, выдатніка аховы здароўя СССР, заслужанага ўрача Рэспублікі Беларусь.

У 2021 годзе ў Мікалая Аляксеевіча Абрамава прафесійны юбілей — 50 гадоў хірургічнай дзейнасці. І гэта нават не маленькае жыццё, а паўвекавы шлях з сотнямі выратаваных жыццяў, тысячамі аперацый і вялізным вопытам.

Мікалай АБРАМАЎ *(злева)*.

Заалогія і анатомія

Ваенная медыцына ў жыцці Мікалая Аляксеевіча — вельмі прыгожае перапляценне лёсаў. Маці Ефрасіння Міхайлаўна была медсястрой хірургічнага профілю, усю вайну працавала ў Гомельскім ваенным шпіталі. Бацька, Аляксей Герасімавіч, ад першага да апошняга дня вайны быў на фронце, артылерыст. І пазнаёміліся яны ў ваенным шпіталі.

У медыцыну хлопец з вёскі Хальч, што на Гомельшчыне, пайшоў дзякуючы маме. А ўмацавалі яго жаданне стаць урачом... трусы. «Калі я вучыўся ў восьмым класе, хросная падарыла мне на дзень нараджэння труса. Я пачаў іх разводзіць, і ў пачатку 11 класа ў мяне ўжо было 110 звяркоў. У іх смачнае мяса, скурку можна было здаць за 5 рублёў. Я адчуў прыбытак і зрабіў такі бізнес. А каб правільна разбіраць трусоў, здымаць скурку, чытаў кнігі па анатоміі, вельмі гэтым захапіўся. Потым гэты навык мне ў інстытуце дапамог. На першых занятках па прэпарыванні трупаў выкладчык выклікаў самага смелага паспрабаваць самастойна. А я ж на трусах натрэніраваны. Так добра ўсё зрабіў, што выкладчык мяне з заняткаў і адпусціў», — успамінае Мікалай Аляксеевіч.

А ўжо пасля другога курса Мікалай Абрамаў правёў сваю першую аперацыю. Падчас навучальнай сястрынскай практыкі ў бальніцы хірург з цікавым прозвішчам Буд-Гусейн забраў студэнта ў аперацыйную: патрэбен быў асістэнт. «У аперацыйнай два пацыенты з гемароем, аперацыя пад мясцовай анестэзіяй. Гэта я цяпер разумею, што аперацыя простая, а тады я вельмі хваляваўся. Першага пацыента хірург аперыраваў, а я проста назіраў. А на другім ён маёй рукой са скальпелем вадзіў. Я потым так сабой ганарыўся», — распавядае Мікалай Аляксеевіч.

Калі Мікалай Абрамаў вучыўся на трэцім курсе, у Віцебскі медыцынскі інстытут прыехаў старшы выкладчык кафедры ваенна-палявой тэрапіі ваенна-медыцынскага факультэта Куйбышаўскага медінстытута. Ён расказаў пра асаблівасці ваеннай медыцыны, пра стыпендыю ў 84 рублі. Будучаму ўрачу спадабалася прапанова стаць ваенным, і Мікалай Абрамаў перавёўся ў Куйбышаўскі медыцынскі інстытут на ваенна-медыцынскі факультэт.

Галоўная ўрачэбная спецыяльнасць

У 1972 годзе хірурга перавялі для працягу службы ў акруговы ваенны шпіталь у Чыту. Аперацыі былі самыя розныя і ішлі адна за адной: перфаратыўная язва страўніка, апендыцыты, кілы, халецыстыт. Вопыт быў каласальны. Там жа Мікалай Аляксеевіч упершыню правёў ампутацыі канечнасцяў. «Добра памятаю першую хірургічную апрацоўку пасля траўматычнай ампутацыі. На начных стрэльбах у бронетранспарцёр трапіў снарад. Мне дастаўся старшы лейтэнант, у яго фуражка ссунулася на вочы. Ён яе падымаў, і ў гэты час ляцеў снарад, які яму тры пальцы і адарваў», — успамінае доктар.

У выратаванні чалавечых жыццяў лішніх ведаў не бывае. Падчас вучобы ў Цэнтральным інстытуце ўдасканалення ўрачоў у Маскве Мікалай Абрамаў захапіўся працамі Аляксандра Вішнеўскага. Ён вучыў аперыраваць пад мясцовай інфільтрацыйнай новакаінавай анестэзіяй. І аднойчы абставіны прымусілі Мікалая Аляксеевіча рабіць аперацыю на страўніку пад мясцовай анестэзіяй. «Падчас майго дзяжурства а 12 гадзіне ночы нам прывезлі салдата, якога трэба было аперыраваць пад наркозам. А анестэзіёлага не было, яны дзяжурылі дома. Я адпраviў дзяжурнага кіроўцу па анестэзіёлага да яго дому, але ён нікога не знайшоў. Я як гэта пачуў, сам разгубіўся. Але што рабіць — аперыраваць трэба, хоць пад мясцовай анестэзіяй. Усяго на гэтую аперацыю ў мяне пайшло чатыры літры раствору новакаіну і тры з паловай гадзіны. Звычайна такія аперацыі доўжацца каля гадзіны, шмат што робіць анестэзіёлаг, а тут усё прыйшлося самому. Вельмі шмат важных дэталяў, якія трэба ведаць і ўлічваць. І, што самае важнае, з салдатам усё было добра», — расказвае пра гэты выпадак хірург.

У 1986 годзе прыйшло прызначэнне ў Мінск, у акруговы ваенны шпіталь Чырванасцяжнай БВА. З 1986 да 1999 года Мікалай Абрамаў узначальваў аддзяленне гнойнай хірургіі. У аддзяленні лячыліся воіны-афганцы. З 1986 года да выводу савецкіх войскаў з Афганістана ў 1989-м у аддзяленні не памёр ніводзін баец. Усяго праз аддзяленне гнойнай хірургіі за час працы Мікалая Аляксеевіча прайшло больш за 280 чалавек з мінна-выбуховымі раненнямі, у якіх былі адарваны рукі ці ногі.

Выбар, які выратаваў жыццё

«Хірург павінен быць і добрым дыягностам, і ўмець аперыраваць, а значыць, валодаць дастаткова высокімі мануальнымі навыкамі, і сумежныя дысцыпліны ведаць, і быць схільным да аналізу, каб выбраць неабходную тактыку лячэння», — кажа Мікалай Аляксеевіч. А яго прыклад пацвярджае, што доктар у дадатак да залатых рук павінен мець вялікае сэрца, каб прасякнуцца гісторыяй кожнага пацыента і выратаваць яму жыццё, каб успрымаць сваіх пацыентаў як родных людзей. У гэтым пераканаўся і Аляксей Талай.

16-гадовага Аляксея, які падарваўся на міне, спачатку лячылі ў гарадской бальніцы ў Оршы, але цяжкасць раненняў і распачатая гангрэна патрабавалі ўмяшання спецыяліста менавіта па падобных раненнях. Начальнік аддзялення гнойнай хірургіі мінскага ваеннага шпіталя Мікалай Абрамаў адправіўся ў Оршу. «Я ехаў, каб ацаніць абстаноўку, пракансультаваць мясцовых урачоў. Галоўны ўрач бальніцы мяне адразу папярэдзіў, што сітуацыя цяжкая. У Лёшы пачалася газавая гангрэна, і яго перавялі ў ізалятар, бо гэтая інфекцыя заразная. Калі мы ўвайшлі, я ўбачыў паміраючага хлопца. І ў паветры стаяў спецыфічны для анаэробнай гангрэны пах. У Лёшы быў пульс 120, у два разы большы, чым трэба ў яго ўзросце, тэмпература высокая», — успамінае Мікалай Аляксеевіч.

Для родных Аляксея прыезд доктара стаў шанцам выратаваць жыццё свайму хлопчыку. Пасля таго як маці ўпала на калені, у хірурга не засталося сумненняў: ён забярэ гэтага хлопчыка ў Мінск. Пад сваю адказнасць, без дазволу ваеннага камандавання Мікалай Аляксеевіч павёз падлетка, які памірае, у ваенны шпіталь. «Прыехалі ў Мінск каля шасці гадзін вечара. Нас ужо чакалі дзяжурны хірург і яго асістэнт. Мы адразу з Лёшам у аперацыйную. Каля сямі гадзін працягвалася аперацыя», — расказвае Мікалай Аляксеевіч.

Аршанскія дактары дапусцілі памылку: зашылі Аляксею раны. Усе ваенныя ўрачы ведаюць, што мінна-выбухныя раненні зашываць нельга, грамадзянскія, на жаль, — не ўсе. «Падчас выбуху адбываецца малекулярнае страсенне тканак і з часам гэта прыводзіць да некрозу. Яны паміраюць. Доктару тканкі здаюцца жывымі, а насамрэч яны мёртвыя. І іх абавязкова трэба выдаляць. Як толькі такія раны зашываюцца, пакінутыя мёртвыя тканкі адразу ж становяцца пажыўным асяроддзем для мікробаў. І пачынаюць гэта ўсё з'ядаць, вылучаючы атрутныя для чалавека таксіны. Калі доктар зашые рану, мікробы будуць яму вельмі ўдзячныя», — наша ўрач.

Выпадак з Аляксеем — не першы ў яго насычанай хірургічнай практыцы. Падобная гісторыя здарылася ў Кобрыне. Падлеткі знайшлі бомбу, пачалі яе раскручваць, яна і ўзарвалася. Ваенныя хірургі Мікалай Абрамаў і Леанід Савіцкі, калі прыехалі, убачылі ва ўсіх зашытыя раны. У перавязачную прывезлі хлопца, якому адарвала голень ніжэй каленнага сустава. Пасля зняцця швоў была выяўлена газавая гангрэна. Дзяцей выратавалі.

Па словах вопытнага хірурга, самае галоўнае ў цяжкіх выпадках — жаданне пацыента выжыць і яго вера ў свае сілы. Шмат у чым гэта залежыць і ад доктара. Псіхалагічны настрой пацыента не менш важны, чым прафесіяналізм яго ўрача, які і заключаецца ў тым, каб правільна настроіць свайго падапечнага.

У 2015 годзе рашэннем Старшыні Камітэта па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце кіраўнікоў урадаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў Героя Савецкага Саюза генерал-лейтэнанта Руслана Аушава медалём «За заслугі ў ваеннай медыцыне» ўзнагароджаны Мікалай Абрамаў. Ваенныя ўрачы ўдастойваюцца гэтага медаля за мужнасць, прафесіяналізм і цярпенне. І гэта той выпадак, калі заслужаная ўзнагарода знайшла свайго героя.

Валерыя СЦЯЦКО.

Фота з асабістага архіва героя публікацыі.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЖИТКОВИЧСКОГО ФИЛИАЛА ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛАСТНОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА, тел. 8 (02353) 2 22 78

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Капитальное строение (магазин «Нептун»)** с инв. № 332/С-129926, площадью 160,5 кв. м, (составные части и принадлежности: пристройка), расположенное по адресу: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Социалистической, 83. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 321650100002000185 площадью 0,0404 га	**60 000,00 руб.**	**6 000,00 руб.**

Срок подачи заявления	**По 17 января 2022 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**18 января 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 18.12.2021 г.
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 7 (семи) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) Продавцу в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в деревнях Узбережье, Кальники Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	**21 января 2022 г. в 11.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 Усяжский сельисполком, кабинет председателя**
3	**Продавец и его адрес**	Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Узбережье (объект № 45/2020) № 624885606101000026 Лот № 2 – земельный участок 0,1500 га в дер. Кальники, ул. Центральная (объект № 98/2018) (по генплану № 3) № 624885603001000110
5	**Условия продажи**	а) без изменения целевого назначения земельных участков; б) продажа по цене не ниже начальной; в) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики, или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь; г) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %; д) наличие не менее двух участников
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	**Начальная (стартовая) цена**	Лот № 1 – 7 000,00 руб. Лот № 2 – 7 000,00 руб.
8	**Условия аукциона**	- продажа по цене не ниже начальной; - участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	Возможность подключения к электроснабжению – лоты № 1,2 Возможность подключения к центральному водоснабжению – лот № 2
10	**Ограничения в использовании**	Отсутствуют
11	**Условия оплаты**	Безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона, без предоставления рассрочки
12	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка **р/с BY49AKBB36410000006276200000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК: AKBBBY2X**, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП с/и 600023836
13	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждая среда в 10.00
14	**Начало приема документов**	**3 января 2022 года в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30**
15	**Окончательный срок приема документов**	**17 января 2022 года в 17.30**
16	**Контактные телефоны**	8 (01776) 67 131, 67 2 88, 8033 902 71 49

Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 2 222 руб. 37 коп., лот № 2 – 1 922 руб. 51 коп. и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

Информация о проведении открытого аукциона 20 января 2022 г. на право заключения договоров аренды земельных участков

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Срок аренды	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	Смолевичский район, Усяжский с/с, п. Усяж, ул. Промышленная	624885606601000314	0,0297	Для установки торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	99 лет	338,58
2	Смолевичский район, Усяжский с/с, п. Усяж, ул. Промышленная	624885606601000315	0,0280	Для установки торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	99 лет	319,20
3	Смолевичский район, Усяжский с/с, аг. Усяжа	624885606701000256	0,06	для установки торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	99 лет	1138,50
4	Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, д. Прилепы, (объект № 01/2020)	624800000002000007	0,7379	Для строительства и обслуживания физкультурно-оздоровительного комплекса (1 16 14 земельный участок для размещения объектов физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения)	99 лет	23059,38
5	Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Лисья Горка	624850100005001001	0,97	Для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (1 09 01 земельный участок для размещения объектов многоквартирной жилой застройки)	20 лет	41472,35
6	Смолевичский р-н, Усяжский с/с, д. Кривая Береза	624885606601000316	0,0726	Для строительства и обслуживания гаража-бокса (1 16 05 земельный участок для размещения автостоянок и гаражей)	50 лет	1009,14

Аукцион состоится 20 января 2022 г. в 15.00

в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, http://rlt.by/ru, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

Центр Промышленной Оценки
- ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
- ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Унитарное предприятие «ИЦТ ГОРИЗОНТ», г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение: г. Минск, ул. Красная, 7

№ лота	Наименование (назначение)	Инвентарный №	Начальная цена с НДС 20 %
1	Токарно-винторезный станок 1ИС611В	95410	5 400,00
2	Токарно-винторезный станок 1ИС611В	95411	4 200,00
3	Станок универсально-фрезерный УФ 250-02	95426	8 760,00
4	Универсально-фрезерный станок 676П	95428	4 080,00
5	Гравировально-фрезерный станок 6Л463	95433	1 440,00
6	Координатно-расточный станок 2421	95437	3 240,00
7	Станок точильно-шлифовальный двусторонний 3Л631	95032	1 128,00
8	Универсально-заточной станок 3М642	95458	3 120,00
9	Круглопильный станок ДЦ-334	95460	1 200,00
10	Токарный станок MN80A	95563	2 280,00
11	Универсально-фрезерный станок 67К25ПФ2-01	98187	7 320,00
12	Универсально-фрезерный станок	98186	7 320,00
13	Координатно-расточный станок 2А440СФ4	95555	12 120,00
14	Ножницы угловые	95622	1 800,00
15	Полировальный шлифовальный станок 3В852	95566	10 440,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете «Звязда» 02.12.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 29.12.2021.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **28.12.2021 до 17.00**

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот: капитальное строение с инвентарным номером 111/С-13490 (наименование: телятник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 669,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новоселковский с/с, д. Прончаки, ул. Луговая, 3А, на земельном участке с кадастровым номером 12508360610100124, площадью 1,7655 га

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**7 049,37**	**Размер задатка, руб.**	**704,94**

Продавец: ОАО «Путь новый», УНП 200058085, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 13 января 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 12 января 2022 г. до 17.00

Ірына АКУЛОВІЧ:

«УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЛЮБОВІ!»

Калі апынаешся ў сценах БелТА, уражвае цішыня, якая відавочна дысануе з той шматлікай дзейнасцю, якую ажыццяўляе агенцтва. Аднак пасля размовы з кіраўніком установы пачынаеш разумець, што першае адчуванне ўяўнае. Сучасны творчы працэс не любіць мітусні, і, каб быць першымі ў сваёй справе, трэба шмат і напружана працаваць. Канкурэнцыя ў інфармацыйнай прасторы сёння, як ніколі, вельмі высокая.

Пра місію БелТА, перспектывы сучаснай журналістыкі і айчынных СМІ, ролю жанчыны-кіраўніка і не толькі мы паразмаўлялі з **генеральным дырэктарам Беларускага тэлеграфнага агенцтва Ірынай Барысаўнай Акуловіч.**

— Апошнім часам у нашай краіне назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя прызначаць жанчын на пасады кіраўнікоў у розных сферах. На ваш погляд, з чым гэта звязана?

— Лічу, тэндэнцыя нядрэнная. Калі паглядзець на тое, што адбываецца ў свеце, некаторыя тэндэнцыі мяне, наадварот, пужаюць. У пэўных краінах Еўрасаюза зараз пачынаецца сапраўдная барацьба за тое, каб мужчына мог назваць сябе мужчынай, а жанчына — жанчынай. З гэтага пункту гледжання, у нашым грамадстве, якое правільна рухаецца і развіваецца, на шчасце, ёсць яшчэ і жанчыны-кіраўнікі, і мужчыны-кіраўнікі. Не магу сказаць, што паміж імі існуе вялікая розніца. Жанчына па прыродзе сваёй думае інакш. Немалаважную ролю адыгрывае і наяўнасць інтуіцыі, якая дапамагае жанчыне прымаць правільныя рашэнні. І калі ў грамадстве разам гавораць мужчыны і жанчыны, прымаць правільныя рашэнні лягчэй. Атрымліваецца сапраўдны баланс.

— Гэта агульная тэндэнцыя. А калі паглядзець больш вузка, на сферу журналістыкі?

— У гэтай сферы жанчын-кіраўнікоў, вядома, шмат. Не на рэспубліканскім узроўні — на ўзроўні абласцей і раёнаў. У газетах і на рэгіянальным тэлебачанні жанчыны наогул дамінуюць. Мужчыны ў большасці займаюць тэхнічныя пасады. А вось пішучыя — жанчыны. Я гэтаму не вельмі рада. Лічу, што мужчын у журналістыцы павінна быць больш.

— Тры з паловай года вы кіруеце інфармацыйным агенцтвам БелТА. Што вам асабіста дала гэтая пасада?

— Па сутнасці, у Мінску я пачала новае жыццё. Шчыра кажучы, калі табе за 40, жыццё ўсталявалася, ёсць дом, сям'я, сябры, любімая праца... Уявіце, амаль 18 гадоў я працавала на тэлебачанні, а тут такія перамены! Здаецца, тая ж журналістыка, але ўсё роўна іншая. Добра, што апошняе месца працы такое ж любімае і дынамічнае, як і тэлебачанне. Ніколі не забудзецца, як ты спрабуеш скінуць сюжэт на «Панараму» (штодзённая інфармацыйная праграма на тэлеканале «Беларусь-1». — «**Зв.**»), звязваешся па спецыяльным тэлефоне з Мінскам са словамі: «Калегі, мы гонім сюжэт!» Ён у выпуску першы, а на гадзінніку 5 хвілін да эфіру. У галаве адна думка: паспеем ці не? Цяпер зусім іншыя тэхналогіі, але адчуванні ўсё роўна тыя самыя. БелТА, па сутнасці, — другая прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Калі трэба выдаваць вельмі хутка важную інфармацыю і фотаздымкі і ты разумееш, што вас чакаюць і права на памылку няма, адчуванні тыя самыя, што і на тэлебачанні.

— Пасля шматгадовай працы на тэлебачанні вы апынуліся ў БелТА. Ці шмат новага прыйшлося асвойваць на новай пасадзе?

— Калі я ўзначаліла БелТА, не да канца ўяўляла сабе той аб'ём работы, які выконвае агенцтва. Канешне, прыйшлося ўнікаць у спецыфіку і многаму вучыцца, бо аўдыявізуальная журналістыка і тэлебачанне — гэта адно, а работа ў інтэрнэце (а сёння тут вельмі вялікая канкурэнцыя) — іншае. Правілы работы, якія існавалі яшчэ 10 гадоў таму, калі ў нас было права першачарговасці ў атрыманні інфармацыі, сёння неактуальныя. У многіх напрамках мы апынуліся ў канкурэнтным асяроддзі. Напрыклад, на мерапрыемствах з удзелам кіраўніка дзяржавы прысутнічаюць не толькі прадстаўнікі нашага агенцтва, але і журналісты іншых вядучых дзяржаўных СМІ. Гэта пастаяннае канкурэнтнае асяроддзе, у якім мы павінны быць першыя.

— Летась БелТА адзначыла 100-гадовы юбілей. Наколькі цяжка кампаніі з такой вялікай гісторыяй адпавядаць тэндэнцыям часу?

— Нягледзячы на салідны ўзрост, мы падладжваемся пад сучасныя ўмовы: развіваем сацыяльныя сеткі, працуем у месенджарах, маем некалькі моўных версій. Шмат увагі — YouTube-каналу і перш за ўсё кантэнту, які звязаны з кіраўніком нашай краіны. Некаторыя апошнія інтэрв'ю, якія Прэзідэнт даў сур'ёзным замежным СМІ, падвергліся жорсткай кадрэктуры інтэрв'юераў. Гледачам падавалася толькі тое, што патрэбна. У гэтай сітуацыі мы хочам, каб пра дзейнасць нашага Прэзідэнта можна было даведацца з афіцыйнай крыніцы і без купюр. Такім чынам мы абараняем інтарэсы нашай краіны. Самае галоўнае — каб інфармацыя ад БелТА была праверэная. І калі выбіраць паміж хуткасцю і дакладнасцю, выберам дакладнасць.

— Сёння інтэрнэт называюць інфасметніцай. Такая колькасць інфармацыі абвальваецца на людзей штодзень. Як не разгубіцца ў гэтых велізарных патоках?

— Інфармацыі сапраўды вельмі многа, мы ўсе ў ёй патанулі. Інтэрнэт — гэта тэхналогіі, якія прыносяць карысць толькі тым, хто імі валодае. У аснове — грошы. У астатнім кожны адказвае за сябе сам. Відавочна адно: у інтэрнэце людзі губляюць шмат часу. А гэта неаднаўляльны рэсурс і самае дарагое, што ёсць у жыцці. Жудасна бачыць, калі людзі, якія прыязджаюць на мора, нават там не могуць адмовіцца ад тэлефона і атрымліваць асалоду ад адпачынку. Мы сваё жыццё вельмі часта не аддаём нават блізкім. Навошта аддаваць яго інтэрнэту? Ён забраў нас з рэальнага жыцця. І з гэтага становішча трэба асэнсавана выплываць.

— Якім чынам вы асабіста гэта робіце?

— Перш за ўсё чытаю сваю крыніцу інфармацыі. Але, каб сфарміраваць пэўную пазіцыю, карыстаюся і іншымі крыніцамі, якія сама для сябе вызначыла. Акрамя таго, пільна сачу, што і як пішуць нашы калегі-канкурэнты. Гляджу тэлебачанне, чытаю матэрыялы «Звязды», «СБ», каб разумець, як мы працуем. Радуе тое, што мы ўсе пачалі працаваць разам. Гэта самы галоўны ўрок мінулага года. Разам мы — сіла!

— Якія веды сёння патрэбны, каб быць паспяховым кіраўніком, і дзе іх чэрпаць?

— Вучыцца сёння, безумоўна, трэба. Усе мы вельмі любім сучасныя модныя плыні: марафоны, вэбінары, анлайн-курсы... Безумоўна, такія формы камунікацыі могуць навучыць вас новым тэхналогіям, спосабам здабытку інфармацыі. На жаль, я гэтым не карыстаюся. Свае веды і ўнутраную моц бяру, перш за ўсё, ад бацькоў. Вельмі часта ўспамінаю свае размовы з татам, калі мы разам хадзілі ў суніцы і грыбы. Менавіта ён падарыў мне ў дзяцінстве падобнае стаўленне да жыцця, працы, да людзей, якое нясу праз усё жыццё. Як казала Маці Тэрэза, «калі хочаш змяніць свет, ідзі дамоў і любі сваю сям'ю!» У гэтым і ёсць аснова ўсяго. І, канешне, я многа чытаю. Нядаўна набыла кнігу Самерсэта Маэма «Тэатр». Чарговы раз пражывала жыццё і думала, што я знайду, калі зайду ў гэты цёмны пакой?

— На вашу думку, каб змяніць свет, з чаго трэба пачынаць?

— Для сучасных людзей вельмі характэрна сітуацыя пракрастынацыі. Мы робім выгляд, што займаемся чымсьці важным, выражаем нейкія сур'ёзныя пытанні. Для таго каб змяніць свет, трэба менш разважаць пра гэта і пачаць з сябе. Калі вакол цябе смецце, вазьмі венік і прыбяры. А калі хочаш паразважаць, лепш задай сабе пытаннне, хто я ёсць і што магу зрабіць для лепшай будучыні? Так трэба жыць самім і такія ж асновы трэба закладваць сваім дзецям.

— Ірына Барысаўна, які вы кіраўнік?

— Пра гэта трэба спытаць у маіх супрацоўнікаў *(смяецца)*. Што датычыцца майго ўнутранага ўспрымання сябе як кіраўніка, то стараюся з павагай ставіцца да людзей, разумець іх, нават калі яны зрабілі памылку. Многія рэчы ў рабоце стараюся зрабіць больш лёгкімі, намагаюся не павышаць голас. Я рэдка ўшчуваю, больш размаўляю. Толькі прымаць рашэнне — гэта не зусім маё. Мне вельмі цікава працаваць у камандзе, быць уцягнутай у творчы працэс. Часта прымаю ў ім удзел, магу нават пісаць пасты ў тэлеграм-канал БелТА, даваць назвы артыкулам, прымаю ўдзел у распрацоўцы банераў. Дарэчы, дзе б я ні працавала, я заўсёды ў творчым працэсе. Для мяне гэта вельмі важна і цікава.

— Калі ўявіць, што сёння лёс зрабіў вам сюрпрыз і зноў вярнуў працаваць на тэлебачанне. У якім напрамку рухацца, каб быць канкурэнтаздольнымі і прыцягваць гледача менавіта з экрана тэлевізара?

— Людзі крыху заблыталіся, калі гаварыць, што асноўная крыніца атрымання інфармацыі для іх інтэрнэт, але не зусім разумеюць, што менавіта там яны глядзяць часткі тэлепраграм, інтэрв'ю. Мы ўсё роўна ствараем кантэнт і дыктуем тэлевізійны парадак дня. Проста падумайце, дзе крыніца кантэнту?

Акрамя гэтага, сучасны чалавек са сваім кліпавым мысленнем не хоча ні думаць, ні напружвацца. Вакол яго нібыта ўтвараюцца відэасцены, з якіх бясконца штосьці транслюецца. Выходзячы з гэтага, трэба даваць людзям выключна забаўляльны кантэнт, а падчас яго трансліраваць пэўную лінію. Але ж мне як чалавеку, які працуе ў інфармацыйнай нішы, гэта не падыходзіць. Я лічу, што трэба працягваць працаваць так, як гэта робяць усе. Ёсць навіны, ёсць інтэрв'ю, забаўляльныя праграмы. Людзі ўсе розныя. Кожнаму сваё. Не бачу зараз новага кантэнту для тэлебачання, але ж лічу, што тыя напрамкі, якія ёсць на тэлебачанні, зараз ні ў якім разе нельга аддаваць. Канкурэнцыя вельмі высокая. Нідзе ў свеце не зніклі салідныя газеты і не знікнуць! Тое ж самае і з тэлебачаннем. Не важна, у якой крыніцы вы будзеце яго глядзець.

— Што для вас больш важна: шлях ці вынік?

— Зараз магу дакладна сказаць, што шлях. Я зразумела, што многія людзі, і я ў тым ліку, шмат часу знаходзяцца ў мінулым, а таксама шмат часу прысвячаюць будучыні. На самай справе жыццё ідзе тут і цяпер. Большую частку свайго часу, сіл і энергіі мы губляем на перажыванне мінулага і хваляванне за будучыню. Самае маё вялікае жаданне — знаходзіцца ў цяперашнім моманце і атрымліваць ад гэтага асалоду. Шлях больш важны, чым вынік, таму што выніку можа і не быць. Але ж мэты ў чалавека павінны быць, гэта безумоўна. Як кажуць, стаўце перад сабой вялікія мэты, у іх лягчэй пацэліць!

— Вы так многа гаворыце пра работу. Але ж жыццё не абмежавана выключна прафесійнай дзейнасцю. Наколькі яно ў вас зараз збалансавана?

— На жаль, пакуль не збалансавана. Работа займае большую частку майго жыцця. Я разумею, што гэта не зусім добра, але пакуль не магу інакш. Справа ў тым, што на дадзены момант слова «работа» і слова «любоў» — сінонімы. Я сапраўды люблю тое, чым займаюся. І вельмі ўдзячная лёсу, што ён прывёў мяне калісьці ў сферу журналістыкі. Я заўсёды лічыла, што тэлебачанне — месца для людзей абраных. Калі мне пашчасціла туды трапіць, я адчула, што гэта тое месца, з якога я ўжо нікуды не пайду. Сваё! Я добра памятаю пачуццё шчасця ад таго, што атрымала прафесію. І сёння я працягваю ім жыць. Калі ты не сваім месцы, то ўсё вакол цябе раздражняе. А пачынацца ўсё павінна з любові...

— Чым вам запомніўся адыходзячы 2021 год?

— Нягледзячы на тое што 2021-ы быў годам знешняга ціску і барацьбы, у эмацыянальным плане ён аказаўся лепшым за 2020-ы. Я шмат працавала, але калі гаварыць пра асабістае, то ёсць адна падзея, якая для мяне сёлета стала вельмі значнай: мой сын прыйшоў з арміі. Як маці я, канешне, вельмі за яго хвалявалася. Хацелася б, каб усе сыны вярталіся з арміі і ў сем'ях усё было добра. Каб гэты тэрмін службы заставаўся для юнакоў выключна школай жыцця, а не якойсьці іншай школай.

— Навагодняя мітусня — гэта ваша гісторыя?

— Я вельмі люблю Новы год і заўсёды стараюся, каб было ўтульна і дома, і на рабоце. Як бачыце, нават у маім кабінеце ёсць сімвалы Новага года. Усе ёлкі зроблены ў адпаведнасці з маімі пажаданнямі. Дэкор — гэта адна старонка свята. Другая старонка — гастранамічная. На святочным стале абавязкова павінна быць качка, фаршыраваная грэчкай і чарнаслівам. Ну, і, канешне, не забываемся пра падарункі для родных. Гэта вельмі важна!

— Што пажадаеце беларусам у надыходзячым новым годзе?

— Наступны — год Тыгра. Я Тыгр, мае дзеці таксама нарадзіліся ў год Тыгра. Спадзяюся, што гэта будзе мой год! Беларусам хачу пажадаць любові да ўсяго і ўсюды. Вельмі хачу, каб людзі разумелі, хто яны ёсць, каб былі шчырымі і шчаслівымі!

Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.

Тэатр

Братоў не выбіраюць

Не толькі сямейныя справы: адлюстравана Дастаеўскім

Напэўна, раман «Браты Карамазавы» з пункту гледжання сучаснага чалавека можна лічыць дэтэктывам: тут ёсць забойства, следчыя дзеянні, сведкі і падсудны, які ў шмат чым можа быць вінаваты, ды толькі не ў забойстве бацькі, але ён вымушаны несці гэты крыж, магчыма, ратуючы душу, і не толькі сваю... А гэта ўжо справа не людская, да яе датычны тонкі свет, у якім шляхі Гасподнія неспавядальныя, і толькі ён вызначае, каму трэба пацярпець дзеля іншых, каму загінуць, а каму ўратаваць душу... Такім чынам, не проста дэтэктыў, а «містычны» — такое вызначэнне знайшлі ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага, дзе адбылася прэм'ера пастаноўкі «Браты Карамазавы» якраз напярэдадні 200-годдзя Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага.

Так сышліся зоркі (ну ці не містыка?!), што прэм'ера аказалася прымеркаваная да юбілею пры тым, што рыхтавалася некалькі гадоў, ды на акадэмічнай сцэне, адноўленай і пераабсталяванай пасля рамонту. Ну і безумоўнае адкрыццё: новая галоўная роля народнай артысткі Беларусі Вольгі Клебановіч. Праўда, на сцэну яна сама не выходзіць, таму што дэбютавала ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка. Але ж галоўны рэжысёр тэатра Сяргей Кавальчык мае сваю долю адказнасці як мастацкі кіраўнік пастаноўкі. Стваральнікі не хаваюць, што нарадзілася ідэя падчас рэпетыцый са студэнтамі, для якіх асабліва важна прапрацоўваць псіхалогію герояў, выбудоўваць матывацыю іх дзеянняў — творы Дастаеўскага наогул даюць для гэтага багатую глебу. Тое, што было напрацавана, не прапала і выйшла на вялікую сцэну ў інтэрпрэтацыі акцёраў тэатра імя Горкага, якія ў сваю чаргу таксама вызначалі матывацыю сваіх персанажаў. Ды сюжэт і словы, што гучаць са сцэны, аздобленыя гульнёй святла і ценю.

У Дастаеўскага сапраўды так: ёсць толькі два бакі — светлы і цёмны, добры і дрэнны. Гэта на вялікім рахунку. Але ў «Братах Карамазавых» усё значна складаней, бо адразу не заўсёды відавочна, хто на якім баку. Акрамя таго, што ёсць заснавальнік роду Фёдар Карамазаў (артысты Аляксандр Ткачонак і Аляксандр Палазкоў) ды параджэнне яго граху (незаконнанароджаны Смердзякоў, які здзяйсняе забойства бацькі, — артыст Сяргей Савянкоў), ёсць паўцені, калі ад таго, хто здаецца прыстойным чалавекам, сыходзіць спакуса забойства (Іван — артыст Ягор Траццякоў), а той, хто жыве ў жарсцях, прызнае сваю недасканаласць (Дзмітрый — Руслан Чарнецкі), у выніку павінен несці пакаранне за ўвесь род. А выхаванец старца Зосімы (артыст Валерый Шушкевіч) чысты душой Алёша Карамазаў (Сяргей Жбанкоў, Андрэй Сенькін) ідзе ў свет людзей, дзе д'ябал з Богам б'юцца за сэрцы людзей. Гэты свет поўны спакус, разборак ды несправядлівасці, і што з Алёшам будзе далей, паводле Дастаеўскага, не да канца зразумела...

Вось і спектакль пакідае пытанні: у кожнага з герояў свой выбар, які і вызначае іх шлях... Вялікая таямніца свету (паводле легенды пра Вялікага інквізітара) — чаму людзей не пазбавілі гэтай свабоды, ведаючы, што яна часам вядзе ў бездань. Застаецца думаць, хто з братоў да яе бліжэй: Іван ці Дзмітрый. І калі бездань — цемра, то, магчыма, яе сутнасць — падкрэсліць святло, якое нараджаецца ў душы, што праходзіць праз пакуты.

Надзвычай складаны раман Дастаеўскага немагчыма перанесці без страт на тэатральную сцэну, дзе ёсць абмежаванне па працягласці. Прыходзіцца выбіраць і сюжэтныя лініі, і тэмы, якія павінны прагучаць, ды каб для гледача захавалася інтрыга. Вядома, ключавое слова тут «паводле». Таму паход у тэатр трэба разглядаць як заахвочванне да чытання. Тут без варыянтаў: Дастаеўскага вы зразумееце настолькі, наколькі захочаце яго зразумець самі. Але важна, калі для гэтага ёсць штуршок.

Дарэчы: за ўвасабленне «Братоў Карамазавых» неаднаразова браліся майстры тэатра, кіно і нават музыкі. Ёсць нават оперы «Браты Карамазавы» — савецкага кампазітара Аляксандра Халмінава і сучаснага кампазітара Аляксандра Смялкова. Пра гэта можна даведацца, у прыватнасці, наведаўшы выстаўку ў нотна-навуковай бібліятэцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У кіно да гэтага рамана звяртаюцца ахвотна. Айчынныя гледачы могуць памятаць экранізацыю рэжысёра Івана Пыр'ева 1968 года і серыял Юрыя Мароза, створаны ўжо ў XXI стагоддзі. Але незвычайны падыход да асэнсавання рамана прадэманстравалі савецкія рэжысёры Грыгор'евы, якія стварылі фільм «Хлопчыкі», узяўшы за аснову дзясятую главу рамана, дзе гаворка ідзе пра сям'ю капітана Снегірова. У Мінску можна паглядзець гэты фільм 24 снежня ў рамках рэтраспектывы ў Музеі гісторыі беларускага кіно, прымеркаванай да юбілею пісьменніка.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Сугучча

Уладзімір Караткевіч у новых маскоўскіх выданнях

У прэстыжным маскоўскім выдавецтве «Престиж Бук» распачата выданне шасцітомнага Збору твораў класіка беларускай літаратуры.

Ужо выйшлі першыя дзве кнігі. У першым томе — «Дзікае паляванне караля Стаха» — аднайменная аповесць, а таксама творы малых жанраў (эсэ, навелы) Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. Перакладчыкам выступіў вядомы беларускі мовазнаўца, паэт і перакладчык Пятро Жаўняровіч. У апошнія гады ён зарэкамендаваў сябе як дасведчаны караткевічазнаўца — і з пункту гледжання даследавання мовы пісьменніка, і як мастацкі перакладчык.

Мастак першай кнігі шасцітомніка — А. Слон. У другім томе Збору твораў «Престиж Бука» — раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды», які таксама пераклаў на рускую мову Пятро Жаўняровіч. Мастацкае афармленне выканала І. Церахава. Дарэчы, сёлетні год — год юбілею першай публікацыі рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», якая спачатку — у 1966 (55 гадоў назад) годзе была здзейснена ў часопісе «Нёман» у перакладзе на рускую мову. Па-беларуску твор надрукаваны асобнай кнігай толькі ў 1972 годзе. А перакладаны раман на рускую мову ў 1960-я гады яркі мінскі паэт і перакладчык Навум Кіслік.

Нагадаем, што Уладзімір Караткевіч з'яўляецца адным з найболей папулярных беларускіх пісьменнікаў. Толькі да яго 90-гадовага юбілею свет пабачылі многія і многія выданні твораў класіка ў арыгінале і па-руску. А ў кітайскай версіі часопіса «Беларусь», пачынаючы са жніўня 2021 года, «Дзікае паляванне караля Стаха» друкуецца ў перакладзе на кітайскую мову. Перакладчык — спадар Сунь Фаньці.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Як пачуць мастацтва

У Нацыянальным мастацкім музеі адбылася прэзентацыя сацыяльна-інклюзіўнага праекта «Карціны, якія ажылі». Асноўная мэта — дапамагчы людзям з парушэннямі слыхавога апарату пазнаёміцца са здабыткамі айчыннага і сусветнага мастацтва. Адзначым, што ў Рэспубліцы Беларусь аналагаў такіх распрацовак пакуль няма. Праект быў здзейснены дзякуючы супрацоўніцтву Інстытута інклюзіўнай адукацыі БДПУ з Нацыянальным мастацкім музеем.

Падчас адкрыцця мерапрыемства **Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея**, адзначыў:

— Напярэдадні Новага года наш музей разам з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка зрабіў такі падарунак наведвальнікам. Прэзентацыя праекта сведчыць аб тым, што сёння ў нас няма ніякіх перашкод у частцы пазнання твораў мастацтваў. Галоўная місія нашага музея — даступнасць для ўсіх.

Працуе ўсё наступным чынам: трэба праз тэлефон адсканаваць QR-код, які знаходзіцца побач з карцінай. Спасылка вядзе да You-Tube-канала музея, дзе сабраны відэаролікі, у якіх сурдагід распавядае не толькі гісторыю стварэння мастацкага твора, але і знаёміць наведвальніка з біяграфіяй мастака і тэхнікамі, якімі ён карыстаўся. Пакуль перакладзена 15 карцін. На першы погляд можна падумаць, што гэта няшмат. Але, па словах вядучага навуковага супрацоўніка музея Надзеі Усавай, усё не так проста, як здаецца на першы погляд. Надзея Усава ўдзельнічала ў праекце «Карціны, якія ажылі» з самага пачатку — пісала тэксты, якія потым павінен быў перакласці сурдагід. Складанасці пачаліся амаль адразу: спачатку не маглі знайсці перакладчыка, а потым высветлілася, што шмат навукова-мастацкіх тэрмінаў проста немагчыма перакласці. Напрыклад, не ведалі, як растлумачыць, што такое імпрэсіянізм. За хуткімі, дзвюххвілінными ролікамі стаіць некалькі гадоў працы вялікай каманды.

Адным з галоўных кіраўнікоў праекта з'яўляецца **дацэнт кафедры карэкцыйна-развіццёвых тэхналогій Інстытута інклюзіўнай адукацыі БДПУ Ірына РУСАКОВІЧ**:

— Упершыню ў краіне створаны такі ўнікальны праект, які дае магчымасць зрабіць усё, каб свет мастацтва стаў бліжэйшы і больш зразумелы людзям з парушэннем слыху. І сёння я адчуваю вялікую радасць. Спачатку здавалася, што рэалізаваць проста, але насамрэч гэта працаёмкі працэс, бо трэба было арганізаваць работу вялікай каманды. Уявіце: на здымкі першага ролика ў нас пайшло сем гадзін. У выніку засталося толькі дзве хвіліны.

Дарэчы, паглядзець ролікі можна і не выходзячы з кватэры. Дастаткова завітаць на канал Нацыянальнага мастацкага музея (усе ролікі знаходзяцца ў свабодным доступе).

Спадзяёмся, што праект паспяхова працягне сваю работу і ў хуткім часе падобныя QR-коды з'явяцца ў астатніх музеях краіны.

Арына КАРПОВІЧ, фота аўтара.

У гонар генія гучала музыка...

Учора ў Віцебску завяршыўся XXXII фестываль імя Івана Іванавіча Салярцінскага. Традыцыйна ў ім бяруць удзел музыканты і выканаўцы з вялікай літары. І зоркі сусветнага ўзроўню лічаць за гонар атрымаць запрашэнне на фестываль. Як і вядомыя мастацтвазнаўцы, крытыкі, якія ўдзельнічалі ў навуковых чытаннях. Дарэчы, іх калегам і быў чалавек, якому прысвечаны фестываль з такой багатай гісторыяй.

У сталіцы Прыдзвінскага краю побач з Арт-цэнтрам Марка Шагала знаходзіцца музычнае вучылішча імя Салярцінскага.

Па традыцыі менавіта ў гэтай навучальнай установе 3 снежня — у дзень нараджэння Маэстра — праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя фестывалю. У канцэрце бяруць удзел вучні і выкладчыкі.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ сёлета ўручыў прэміі «абласнога парламента» навучэнцам дзіцячых школ мастацтваў і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія дэманструюць вялікія поспехі ў вучобе, паспяхова выступаюць у конкурсах.

У філармоніі першай афіцыйнай падзеяй 5 снежня стаў канцэрт пераможцы XV Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага, лаўрэата міжнародных конкурсаў Дзмітрыя Маслеева (фартэпіяна) з Расіі. Прагучалі творы Рахманінава, Шастаковіча, Хачатурана, Равеля і Петухова.

Піяніст, між іншым, упершыню выступіў у Беларусі. У шчыльным графіку гастроляў цудам знайшоўся час, каб прыехаць у Віцебск з Мюнхена. Пасля завяршэння яго выступлення ў філармоніі ўдзячная публіка прасіла выступіць на біс і доўга не адпускала са сцэны аднаго з самых запатрабаваных піяністаў у свеце.

10 снежня выступіў Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор, заслужаны артыст Расіі Яўген Бушкоў). А кропку ў фестывальным марафоне феерычна паставіў Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі, народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Выбраць гэты шлях мне падказаў Бог...»

«Заўтрашні дзень сам пра сваё паклапоціцца...»

Так гаворыцца ў Евангеллі ад Матфея. Жаночы манастыр у гонар Святых Жонак-Міраносіц жыве ў адпаведнасці з такой біблейскай прытчай. Гэта велізарная тэрыторыя з паўразбуранымі будынкамі Бабруйскай крэпасці, якія лічацца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Сёстры не баяцца працы, але іх усяго восем. Без дапамогі звонку такую вялікую нерухомасць немагчыма ўтрымліваць. Яна патрабуе вялікіх выдаткаў, але сёстры моляцца, і Бог іх не пакідае.

— Нядаўна мне прыснілася матушка Маргарыта, якая прымала мяне ў Свята-Пакроўскі манастыр у Кіеве, — расказвае ігумення. — Той манастыр быў вельмі вялікі — на 400 чалавек. У сне я ўбачыла нашу велічэзную трапезную і ігуменню за сталом. Я так узрадавалася, што ёсць магчымасць звярнуцца да яе па параду. Але яна да мяне падышла сама і нешта прашаптала на вуха. На жаль, я нічога не зразумела, але прачнулася з прадчуваннем вялікай радасці. Так і адбылося. У гэты дзень нашаму манастыру зрабілі багатае прынашэнне, самае шчодрае за год. Былі і іншыя нагоды для радасці. А яшчэ ўдзячнасць Богу за тое, што ён паклапаціўся пра нас.

Боршч для патрыярха Кірыла

Адзіная сцэнічная роля, якую сыграла ў часы свайго даманастырскага жыцця сураэмоўніца, — Папялушка. Матушка смяецца, што гэта амплуа ў яе захоўваецца па жыцці.

— Калі толькі прыйшла ў Свята-Пакроўскі манастыр у Кіеве, адразу ж трапіла на кухню на паслушэнства, — успамінае яна. — Аціраліла тыя маштабы і зразумела, што ролю Папялушкі прыдзецца выконваць па-сапраўднаму. Там былі вялікія печы і катлы, трэба было навучыцца выграбаць попел, распальваць дровы, перабіраць горы круп, наразаць вёдры цыбулі, морквы, капусты, бульбы, гадзінамі пячы катлеты. Бо, акрамя нашай вялікай манастырскай сям'і з 400 чалавек, мы кармілі яшчэ і паломнікаў. А іх было вельмі шмат. Такое правіла ўвяла яшчэ ў канцы XIX стагоддзя вялікая княгіня Аляксандра Пятроўна з роду Раманавых (у манастве Анастасія), якая заснавала манастыр.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля ўзвядзення ў сан ігуменні *(з посахам, побач з епіскапам)* епіскапам Серафімам Бабруйскім і Быхаўскім *(з правага краю бацька ігуменні)*.

З кіеўскага перыяду жыцця засталося шмат цікавых успамінаў. Калі працавала на кухні, гатавала боршч для самога патрыярха Кірыла і яго спадарожнікаў. Яны прыязджалі ў манастыр з візітам. Усе вельмі хвалявaліся, хацелася дагадзіць высокаму госцю. І яму трапеза спадабалася. (Парада тым, хто любіць баршчы насычанага чырвонага колеру. Матушка раіць варыць бурак асобна ў таматным соку і заліваць у агульную каструлю ў апошнюю хвіліну. І не кладзіце зверху накрыўку: боршч можа страціць свой прыгожы колер.)

У манастыр праз балет

У балет яна трапіла ў 10 гадоў. Вучылішча знаходзілася ў старым будынку, дзе для балерын былі пасапраўднаму спартанскія ўмовы: прыбіральня на вуліцы, агульныя непрыстасаваныя грымёркі, пастаянныя скразнякі.

— Балетная школа вельмі моцна мяне дысцыплінавала, навучыла працаваць над сабой, не ленавацца, абмяжоўваць у смачнай ежы, ад якой набіраюць вагу, — успамінае матушка той перыяд. — У 10 гадоў я цалкам забыла, што такое пірожныя і бліны. У меню былі выключна капуста, морква, некаларыйныя кашы, бульба толькі ў печаным выглядзе. І так на працягу васьмі гадоў. Але ніхто не скардзіўся. У нас быў цудоўны дырэктар Юрый Гаршкоў. Ён казаў, што для таго, каб танцаваць на сцэне Вялікага тэатра, патрэбен усяго адзін працэнт таленту і 99 — працы. Так што я загартаваная з дзяцінства.

Нягледзячы на сваё жаданне стаць балерынай, Наталля ўсё ж такі прасіла Бога дапамагчы знайсці свой шлях у жыцці. Нехта падказаў ёй словы кароценькай малітвы, і яна вельмі часта іх паўтарала: «Господзі, напраў мае ступні на праведны шлях». Малілася і зусім не ўяўляла, што яе чакае манастыр.

Ці шкадуе яна сёння, што зрабіла такі выбар? У асноўным — не. І ўдзячна Богу за свой балетны перыяд жыцця. Дарэчы, балетная паходка ў яе так і засталася. Успамінае, што, калі яе ўпершыню паставілі ў манастыры мыць посуд, яна трымала спіну перад ракавінай, як каля балетнага станка. Некаторыя думалі, што яна манернічае, рабілі заўвагі. Нават яе ўсмешка не ўсім падабалася. Але маладая паслушніца пакорліва цярпела гэтыя папрокі, бо шчыра верыла ў Бога.

Няма благаслаўлення замуж выходзіць

Ну якая дзяўчына ў 18 гадоў не марыць пра замужжа? Наталля не была выключэннем. Узяць, напрыклад, яе партнёра па танцах Уладзіміра Статнага. Гэта зараз ён заслужаны артыст Малдовы і саліст Адэскага тэатра оперы і балета, а тады быў такі ж пачынаючы танцор, як і сама Наталля. Лічыцца, што партнёр па танцах і ёсць першы «муж» балерыны. Бо без сімпатыі адно да аднаго цяжка перадаваць пачуцці на сцэне. На той перыяд былі нават прапановы выйсці замуж. Яна ж шукала веруючага.

— Незадоўга да заканчэння харэаграфічнай установы я пабывала ў Адэскім Свята-Успенскім манастыры, дзе пазнаёмілася са старцам архімандрытам Іонам (Ігнаценкам). — кажа яна. — Ён неяк агульна сказаў, што «апошнім часам няма благаслаўлення замуж выходзіць». Тады я не зразумела, ці датычылася гэта мяне, цяпер дакладна ведаю, каго ён меў на ўвазе.

Калі Наталля ўпершыню прыехала ў Свята-Пакроўскі манастыр, каб вызначыцца, чаму прысвяціць сваё жыццё, яна зноў прасіла Бога адкрыць ёй яе шлях. І вось падчас службы на Дзень адсячэння галавы Іаана Хрысціцеля яе быццам бы агнём апякла думка, што святы загінуў з-за танцоўшчыцы. З таго часу тэма балета для яе была закрытая. А потым прысніўся танцуючы Марыс Ліепа. Ён круціў фуэтэ, а яна думала: як такое магчыма, ён жа памёр?! Падышла да яго бліжэй і спыталася: дык гэта праўда, што ў Бога ўсе жывыя? Ён прыпыніўся, перахрысціўся і сказаў: «Так, у Бога ўсе жывыя».

Хобі матушкі Параскевы

У пакоі, дзе мы сядзім, вельмі светла і ўтульна. На стале ціха міргаюць лампадка, на канапе дрэмле кот па мянушцы Грэй. Ён вельмі вялікі і сярдзіты на выгляд. Але матушка Параскева яго вельмі любіць і жартам называе архіерэйскім. Яна частуе мяне манастырскімі стравамі, і мне здаецца, што нічога на свеце няма смачней за гэты посны баршч і марынаваныя грыбочкі. А яшчэ сухарыкі. Іх тут нарыхтавалі на некалькі месяцаў наперад.

Матушка яшчэ і вялікая рукадзельніца. Любіць вышываць, рабіць закладкі для кніг. Успамінае, што ўсяму гэтаму навучылася падчас свайго апошняга паслушэнства ў кіеўскім манастыры. Удзельнічала нават у рэстаўрацыі старадаўняй плашчаніцы канца XIX стагоддзя. А да гэтага вышыла некалькі пар тапачак на мошчы прападобных Кіева-Пячэрскіх старцаў Маісея Угрына і пустэльніка Лаўрэнція, епіскапа Тураўскага.

А яшчэ яна любіць фатаграфаваць, музіцыраваць, пісаць вершы. Адзін прысвяціла гадавіне свайго падзвіжніцтва ў бабруйскім манастыры: *«У жизни нет черновиков, // Рисуя каждую страницу, // Мы выбираем тишину // Или кипучую столицу»*.

— Дзякую Богу за тое, што ён прывёў мяне да сябе, — кажа яна. — Менавіта ў царкве я адчула абароненасць. Я ў бацькоў адзінае дзіця і вельмі часта не ведала, з кім падзяліцца патаемным. Не ўсё ж можна бацькам расказаць. А ў царкве ўсё мудра наладжана. Ёсць духоўны айцец, з якім можна адкрыта пагутарыць і пра ўсё спытацца. Адна манашка мне сказала, і я з ёй цалкам згодная: Богу ад нас патрэбна толькі Падзяка. І болей нічога — у яго і так усё ёсць, увесь сусвет.

Пад заступніцтвам святога Аляксандра

Імя Аляксандр вельмі сімвалічнае ў лёсе матушкі Параскевы. Па-першае, так завуць яе бацьку. Па-другое, на дзень памяці святога князя Аляксандра Неўскага — 12 верасня — нарадзілася яе бабуля. Гэта яшчэ і дзень анёла яе таты. Па-трэцяе, у дзяворцтве яна марыла, што такое імя будзе ў яе мужа або ў сына. Але нават і ў сне не магла ўявіць, што ёй прыйдзецца будаваць сабор у гонар Аляксандра Неўскага на тэрыторыі бабруйскага манастыра.

Яго пачала ўзводзіць — на месцы калісьці разбуранага — яшчэ яе папярэдніца, ігумення Раіса. Яна дабілася дазволу, каб манастыру дапамаглі сілавыя ведамствы. На гэтым шляху яе змяніла матушка Параскева. Сёлета яна пабывала на прыёме ў Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, якая вельмі цёпла прыняла і пасадзейнічала сустрэчы з міністрамі абароны і ўнутраных спраў.

— Міністр абароны сказаў, што яны мараць пра храм узброеных сіл і для іх за гонар дапамагаць у будаўніцтве сабора Аляксандра Неўскага, — кажа матушка Параскева. — З дапамогай Божай і нашых дабрадзеяў спадзяёмся налета асвяціць храм. Наогул, робім усё, каб наш манастыр стаў вядомы. Развіваем сястрыцтва пры манастыры. З гэтай нагоды ў нас створаны Саюз праваслаўных бабруйчанак. Пра нас не забывае Беларускі саюз жанчын, сёлета ў гасцях пабываў яго прэзідыум на чале са старшынёй Аленай Богдан. Падтрымліваем добрыя адносіны з суседзямі — 147-й зенітнай ракетнай брыгадай. Яны заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу. Да нас прыязджаюць дэпутаты, прыходзіць шмат паломнікаў. Наш бацюшка Аляксандр вельмі цярплівы, вытрыманы. У манастыр цягнуцца рупліўцы набожнасці, аматары вялікіх службаў, якія любяць, каб усё вычытвалася і нічога не скарачалася. Мы з сёстрамі рады, што манастыр становіцца цэнтрам прыцягнення прыхільнікаў праваслаўнай веры. Для нас васьмярых хапіла б і дамавой царквы, але сабор, які мы адраджаем, патрэбны гораду, краіне.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва матушкі Параскевы.

г. Бабруйск.

Марафон дабра

КНІГІ Ў ПАДАРУНАК

Мсціслаўская спецшкола-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення атрымала некалькі соцень кніг выдавецтва «Звязда»

Такі падарунак ім зрабіла Беларуская ўніверсальная таварная фірма сумесна з Выдавецкім домам «Звязда» ў рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці».

Кнігі тут любяць і цэняць, запэўнілі настаўнікі. Дзеці малодшых класаў з задавальненнем чытаюць дзіцячую літаратуру, любяць казкі. Спецшкола — адзіная ў вобласці агульнаадукацыйная ўстанова для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення. Агульная колькасць дзяцей, якія тут вучацца, з улікам дашкольнай групы складае 120 чалавек.

— Гэта дзеці, якія патрабуюць дадатковай увагі з боку дарослых, — удакладняе **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Мсціслаўскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення Алена ЗУБКОВА.** — Сярод іх ёсць сіроты і тыя, якія засталіся без апекі бацькоў, бо жывуць у асацыяльных сем'ях. Ім вельмі важна ведаць, што пра іх клапоцяцца і не забываюць.

Бібліятэка ўстановы папоўнілася 350 кнігамі «Выдавецкага дома «Звязда».

— Гэта краязнаўчая і гістарычная літаратура, проза, паэзія, казкі нашых пастаянных аўтараў. Менавіта тая літаратура, якая разлічана на дзяцей малодшага ўзросту і старшакласнікаў, — удакладніла **вядучы спецыяліст аддзела «Выдавецкага дома «Звязда» Алена ШЫМАНСКАЯ.**

Дзеці ў знак падзякі падарылі дабрадзеям невялічкі канцэрт. **Намеснік дырэктара «Выдавецкага дома «Звязда» Уладзімір МОСІН** падзякаваў ім за шчырыя выступленні і разам з віншаваннямі з надыходзячымі навагоднімі святамі ўручыў намесніку дырэктара школы-інтэрната Таццяне Астапенцы падарачны сертыфікат.

— Спадзяёмся, што кніжкі нашых беларускіх пісьменнікаў Міхася Пазнякова, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Генадзя Аўласенкі, Людмілы Рублеўскай і іншых аўтараў, якія на працягу многіх гадоў супрацоўнічаюць з нашым выдавецкім домам, прыдуцца вам па душы, — адзначыў ён. Кранальна было пачуць ад дзяцей іх агульнае «дзякуй!».

Кіраўніцтва Мсціслаўскай школы-інтэрната паклапацілася арганізаваць цікавую экскурсію і паказаць школьны музей. Тут захоўваюцца такія рэдкія экспанаты, як пераходны сцяг Народнага камісарыята асветы БССР, прадметы з месцаў раскопак, дыярамы знакавых падзей савецкай краіны, зробленыя вучнямі і настаўнікамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

г. Мсціслаў.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СтанкоГомель» (продавец) извещает о проведении 12 января 2022 года повторного открытого аукциона со снижением стоимости на 20 % по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-75612 (наименование – административное здание; назначение: здание административно-хозяйственное), общей площадью 5762,7 кв. м, составные части и принадлежности: три забора (кирпичный с бетонным основанием, железобетонный), ворота откатные; комплектная трансформаторная подстанция КТП-1000 напряжением 10кВ с инвентарным номером № 4810, предназначенная для обслуживания капитального строения; внутриплощадочная тепловая сеть с инвентарным номером № 2242 протяженностью 16,0х2 п. м.

Дополнительно сообщаем: ОАО «СтанкоГомель» заключен договоры аренды с УП по оказанию услуг «А1» и ППО ОАО «СтанкоГомель» «БЕЛПРОФМАШ». Предметы договоров – нежилое помещение на 8-м этаже административного здания общей площадью 13,2 кв. м и часть кровли здания («А1»); нежилые помещения общей площадью 28,13 кв. м в административно-хозяйственном здании («БЕЛПРОФМАШ»)

Местонахождение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 10

Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001006125, площадью 0,1331 га

Начальная цена продажи с учетом НДС: 3 268 288,00 бел. рублей

Задаток (5 %) с учетом НДС: 163 414,40 бел. рублей

Продавец: ОАО «СтанкоГомель», г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. Контактный телефон +375 44 775 83 41.

Шаг аукциона – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **продавца (ОАО «СтанкоГомель»): р/с BY28AKBB30120363505 00253100000** в ОАО «АСБ Беларусбанк», **БИК AKBBBY21302, УНП 400085002, ОКПО 05802968.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.01.2022 г. в 17.00.**

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; **возможна рассрочка оплаты**. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**
Продавец	**ООО «ВОСТОКИНВЕСТ», Минская обл., г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 12А, оф. 306**

Предмет аукциона

ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ
(помещение многофункциональное),

общ. пл. **2 169,2 кв. м**, инв. № **644/D-47731**, адрес: Минская обл., г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 12А-2. Ограничения / обременения: аренда

Начальная цена: 1 500 000 долларов США (без НДС).
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней с даты проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов:
Оплата победителем электронных торгов (единственным участником электронных торгов, давшим согласие на приобретение имущества по цене, увеличенной на 5 %) осуществляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты. Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **19.01.2022 с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 17.01.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные организатора аукциона	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by**

Извещение о проведении **30 декабря 2021 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе

№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учётом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, отапливаемая пристройка, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения	Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239	133 200,0	13 300,0
2	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание ароучного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245	49 800,0	4 900,0
3	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/3, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0427 га, кадастровый номер – 141000000001005219	25 260,0	2 500,0
4	Капитальное строение** с инв. номером 110/С-113574, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/4, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0997 га, кадастровый номер – 141000000001005218	61 200,0	6 100,0
5	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/6, общей площадью 1 212,7 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216	146 400,0	14 600,0
6	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217	102 000,0	10 200,0
7	Капитальное строение*** с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м, составные части и принадлежности: навес, наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244	88 200,0	8 800,0
8	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211	81 600,0	8 100,0
9	Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель	Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212	26 640,0	2 600,0
10	Капитальное строение**** с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213	25 920,0	2 500,0
11	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117142, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/14, общей площадью 291,7 кв. м, наименование – здание кирпичного гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)	Площадь – 0,0980 га, кадастровый номер – 141000000001005240	34 740,0	3 400,0
12	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243	82 200,0	8 200,0
13	Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, составные части и принадлежности – этаж подвальный, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака	Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214	27 000,0	2 700,0
14	Капитальное строение***** с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215	23 820,0	2 300,0

Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется осмотр

** Ограничения (обременения): аренда до 31.12.2021 г. ** Ограничения (обременения): аренда до 11.07.2022 г.*
**** Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г. **** Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.*
****** Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.*

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 30.12.2021 по предмету торгов № _ _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **30 декабря 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 20.12.2021 по 28.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).
Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ВАКЦЫНАВАЦЦА АД ГРЫПУ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Таццяна Пятроўна, з'яўляюцца паведамленні, што захваральнасць на грып апошнім часам расце. Ці праўда, што больш хварэюць дзеці?

— За мінулы каляндарны тыдзень на тэрыторыі Мінскай вобласці рэгістравалася захваральнасць на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, ніжэйшая на 9,3 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

У структуры хворых удзельная вага дзіцячага насельніцтва ва ўзросце да 18 гадоў склала 63,6 працэнта. Захворванне абумоўлена пераважна вірусамі негрыпознай этыялогіі — адэнавірусамі, рэспіраторна-сінцыцыяльнымі вірусамі, рынавірусамі, бакавірусамі, таксама адзначана цыркуляцыя вірусаў грыпу А (H3N2). Можна казаць пра тое, што цыркулююць сумесна як вірусы SARS-CoV-2, так і грыпу.

— Чым небяспечны грып для дзяцей?

— Грып — гэта вострая вірусная інфекцыя дыхальных шляхоў, якая характарызуецца паражэннем слізістых абалонак верхніх дыхальных шляхоў, ліхаманкай, інтаксікацыяй, а таксама парушэннем дзейнасці сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм.

Захваральнасць на вострыя рэспіраторныя інфекцыі і грып у дзяцей у некалькі разоў вышэйшая, чым у дарослых. Асабліва ўразлівыя дзеці да грыпу. Прычына гэтага — недастаткова сфарміраваны імунітэт. Малыя з большай верагоднасцю рызыкуюць атрымаць ускладненні інфекцыі, найбольш часта ў іх дыягнастуюць пнеўманію. Грып у дзяцей можа мець цяжкі ход.

— Ці шмат людзей прышчапілася ў гэтую прышчэпачную кампанію ад грыпу?

— Па стане на 14 снежня бягучага года ў Мінскай вобласці супраць грыпу прышчапілася ўсяго 32,7 % насельніцтва. Ахоп прышчэпкамі дзяцей — 32 % ад іх колькасці. Прышчэпачная кампанія працягваецца да 1 студзеня 2022 года. Вакцына ёсць ва ўсіх рэгіёнах у колькасці, дастатковай для ахопу не менш за 40 % насельніцтва.

— Аднак ці мае сэнс прышчапляцца зараз, калі ідзе рост захворвання? Ці паспее выпрацавацца імунітэт?

— Тым, хто яшчэ не прышчапіўся супраць грыпу, не позна прайсці імунізацыю. Імунітэт выпрацоўваецца на працягу трох тыдняў. Вядома, існуе рызыка ў гэты перыяд захварэць. Але калі не прышчапіцца, то гэтая рызыка застанецца на працягу ўсяго эпідсезона, прычым з ростам захваральнасці рызыка таксама будзе павышацца.

Эфектыўнасць вакцынацыі супраць грыпу на працягу шэрагу гадоў на тэрыторыі нашага рэгіёна складае не менш за 90 працэнтаў. Гэта азначае, што захваральнасць на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі сярод прышчэпленых на 90 % ніжэйшая, чым сярод тых, хто адмовіўся ад вакцынацыі.

— Ці можна сумяшчаць прышчэпку ад грыпу і COVID-19?

— Важнасць і неабходнасць правядзення прафілактычных прышчэпак як супраць грыпу, так і супраць COVID-19, не падлягае сумненню. Прышчэпкі супраць гэтых захворванняў можна сумясціць і зрабіць альбо ў адзін дзень, альбо з інтэрвалам у два тыдні. Таксама варта звярнуць увагу на мэтазгоднасць правядзення бустэрнай вакцынацыі супраць COVID-19 вакцынай «Спадарожнік Лайт» усім асобам, якія раней прышчапіліся любой вакцынай, праз шэсць месяцаў пасля завершанага курса вакцынацыі.

— Якія меры прафілактыкі, знаёмыя нам па COVID-19, дапамагаюць не заразіцца грыпам?

— Даныя аб эпідэміялагічных і вірусалагічных асаблівасцях вірусаў паказваюць, што актыўная вакцынацыя супраць грыпу і COVID-19, а таксама выкарыстанне масак, апрацоўка рук, захаванне «рэспіраторнага этыкету» і дыстанцыі прыводзяць да зніжэння колькасці выпадкаў заражэння.

— Ці ёсць прагнозы, які ў гэтым годзе чакаецца сезон грыпу? Ці не занадта рана ён сёлета пачаўся?

— Сезон захворвання на грып і ВРІ пачынаецца з 40-га тыдня года і прыпадае на пачатак кастрычніка, а працягваецца да 20-га тыдня наступнага года (пачатак мая). Па шматгадовай дынаміцы захваральнасці ўздым прыходзіцца на канец студзеня — пачатак лютага.

— Ці трэба прышчапляцца ад грыпу дзецям? З якога ўзросту гэта можна рабіць?

— Вакцынацыя дзяцей супраць грыпу праводзіцца, пачынаючы з 6-месячнага ўзросту, бясплатна. Сёлета ў Беларусь для дзяцей паступіла вакцына «Грыпол Плюс» расійскай вытворчасці. Таксама па жаданні бацькоў дзіця можна прышчапіць вакцынай «Ваксігрып Тэтра», але ўжо на платнай аснове. Калі дзіця прышчапляецца першы раз і раней не хварэла на грып, то прышчэпку неабходна зрабіць двухразова з інтэрвалам у чатыры тыдні.

— Ці можна адначасова захварэць на грып і COVID-19? Чым гэта небяспечна?

— У медыцынскай літаратуры апісваецца падвойнае інфіцыраванне — калі чалавек адначасова заражаецца і грыпам, і COVID-19. Гэта вельмі небяспечна як для саміх хворых, асабліва калі ў іх ёсць хранічныя паталогіі, так і для навакольных. Пра гэта папярэджваюць расійскія навукоўцы. Калі чалавек заразіўся грыпам раней, тэст-сістэмы могуць не выявіць SARS-CoV-2. А значыць, інфіцыраваны працягне распаўсюджваць небяспечны штам.

— Як па сімптомах адрозніць грып ад прастуды і COVID-19? Чым яны падобныя і ў чым адрозненне?

— Галоўнае, што адрознівае грып ад звычайнай прастуды, — рэзкі пачатак захворвання. Як правіла, для ВРВІ характэрны больш плаўны пачатак: спачатку проста пяршыць у горле, трохі закладвае нос, могуць адчувацца агульная слабасць і недамаганне.

У выпадку з грыпам падзеі развіваюцца імкліва. Чалавек адчувае ламоту ва ўсім целе і боль у мышцах, тэмпература цела рэзка падымаецца да 38-39 градусаў, хворага адольвае моцная слабасць, сімптомы хутка нарастаюць, з'яўляюцца насмарк, сухі кашаль, які дзярэ горла, моцны боль у горле, аж да немагчымасці глытаць, часта далучаецца млоснасць, выкліканая інтаксікацыяй арганізма, а таксама болі ў жываце, дыярэя і іншыя дыспепсічныя расстройствы, якія суправаджаюцца абавязковай стратай апетыту. Скурныя пакровы «грыпуючага» бледныя, на шчоках можа прысутнічаць нездаровая чырвань.

Яшчэ адна важная характэрная для грыпу асаблівасць — больш працяглы перыяд захворвання. Калі пры прастудзе хворы звычайна прыходзіць у норму менш чым за тыдзень, то выздараўленне пры грыпе займае куды больш часу. Толькі тэмпература можа трымацца да 4-5 дзён, а сам аднаўленчы перыяд, як правіла, займае да двух тыдняў, а то і даўжэй, калі да вірусной інфекцыі далучаецца бактэрыяльная ці ўзнікаюць іншыя ўскладненні.

Сярод асноўных сімптомаў грыпу — рэзкае павышэнне тэмпературы цела да 38-39 градусаў, боль у мышцах, агульная слабасць, насмарк, кашаль, боль у горле. Але, як бачым, большасць з гэтых непрыемных праяў даймае нас пры любых ВРВІ. Больш дакладна адрозніць грып ад звычайнай прастуды і ад COVID-19 можна, ведаючы наступныя асаблівасці.

Тэмпература. Пры каранавіруснай інфекцыі ўласціва яе павышэнне ад 37 градусаў, пры грыпе — ад 38, пры звычайнай прастудзе фебрыльнай тэмпературы часта няма зусім.

Насмарк. Пры грыпе і прастудзе ў пацыентаў нярэдка сустракаюцца скаргі на моцныя слізістыя выдзяленні з насавых праходаў. Пры каранавірусе гэтага няма — звычайна ёсць заложанасць носа і страта нюху. Пры грыпе здольнасць адчуваць пахі таксама можа часткова знікнуць, але звязана гэта будзе хутчэй з заложанасцю носа, і ў чалавека застаецца магчымасць успрымаць асабліва моцныя і рэзкія пахі, тады як пры ковідзе яна адсутнічае цалкам.

Кашаль. Для ковіду ўласцівы сухі знясільвальны кашаль, пры грыпе і прастудзе кашаль плаўна перацякае ў мокры з макротай.

Алена КРАВЕЦ.

САЗ: «Амікрон» ужо ёсць у большасці краін, нават калі яшчэ не знойдзены»

Сусветная арганізацыя аховы здароўя чакае росту колькасці шпіталізацый і смерцяў з-за «амікрон»-штама каранавірусу. Аб першым смяротным выхадзе ад яго 13 снежня паведаміла Вялікабрытанія.

Новы варыянт каранавіруса «Амікрон» распаўсюджваецца хутчэй, чым папярэднія, а выявілі яго ўжо ў 77 краінах, заявіў **генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас ГЕБРЭСУС.**

— Семдзесят сем краін паведамілі аб выпадках «амікрона». Верагодна, што насамрэч ён ёсць у большасці краін, нават калі яшчэ не знойдзены, — сказаў гендырэктар САЗ.

Ён адзначыў, што арганізацыя недаацэньвала вірус, таму што ён можа абрынуць сістэмы аховы здароўя, якія не гатовы да вялікай колькасці выпадкаў заражэння ім. Гебрэсус нагадаў, што вакцынаваным людзям трэба гэтак жа насіць маскі і выконваць дыстанцыю, як і непрышчэпленым.

На думку **рэктара Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігара СТОМЫ,** наяўныя вакцыны абараняюць у першую чаргу ад цяжкіх формаў захворвання і смяротных выхадаў, што справядліва і ў дачыненні да «амікрону».

— Мы не гаворым, што вакцыны гарантуюць адсутнасць верагоднасці захворвання. Але ў выпадку захворвання паствакцынальная аборона дапамагае справіцца з інфекцыяй і рэзка зніжае верагоднасць цяжкіх формаў і смяротных выхадаў, — тлумачыць Ігар Стома.

На яго думку, магчымыя два напрамкі эвалюцыі COVID-19. Адзін заключаецца ў тым, што «амікрон» сапраўды будзе распаўсюджвацца хутчэй, чым дэльта, у выніку чаго выцісне яго ў большасці краін. Аднак пры гэтым яго патагеннасць і адпаведна цяжар захворвання не павысяцца. Гэта магчымы шлях эвалюцыі віруса, які, не выключана, наблізіць нас да завяршэння пандэміі. У далейшым «амікрон» або падобныя яму штамы могуць стаць сезоннымі.

Другі варыянт развіцця падзей менш спрыяльны: вірус актыўна распаўсюдзіцца і пры гэтым цяжар захворвання будзе дастаткова высокі. Найбольш спрыяльны для чалавецтва, вядома, першы варыянт.

Як паведаміў у пачатку тыдня **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** «амікрон»-штам каранавіруса ў Беларусі пакуль не выяўлены.

— Мы яго шукаем усімі ўзмоцненымі спосабамі. Мы бачым з адкрытых крыніц, што гэты штам выклікае захворванне не цяжэй, чым штам «дэльта». Ён распаўсюджваецца хутчэй, кажучы простай мовай, але пры гэтым цяжар яго захворвання не вышэйшы, чым у «дэльта»-віруса. Пра гэта кажуць даследаванні, — адзначаў міністр.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «АМКОДОР»– управляющая компания холдинга» (Продавец)

Лот № 1:
НЕЗАВЕРШЕННОЕ ЗАКОНСЕРВИРОВАННОЕ КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ,
инв. № 500/U-65431, площадь (по данным тех. паспорта) – 5 218,6 кв. м, г. Минск, ул. Пономаренко, 7/12.

Начальная цена с НДС – 1891000,00 руб. **Задаток** – 189100,00 руб.
Земельный участок 500000000006000098, 7,6447 га.
Право постоянного пользования.
Аукцион состоится **12.01.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – **10.01.2022 в 11.00**.
Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by
УНП 190055182

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении **30.12.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/12/spisok-imushhestva-rsp12-na-torgi-30.12.21.pdf
Местонахождение имущества: Гродненская область, Кореличский район, г.п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.
Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.
Продавец: ОАО «РСП-12», тел. +375293667568.
Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.
Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **29.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкрот-Аукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).
Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 20.12.21** по **17.00 29.12.21** на bankrottorg.by.
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.
Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.
Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.
Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.
Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.
В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лотам №№ 39, 44, 99, 108–113 – **5 %** от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – **7 %** от цены реализации предмета торгов.
Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.
Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

Нурсултан НАЗАРБАЕЎ:

«Толькі правільна пастаўленыя мэты прыводзяць да поспеху»

На гэтым тыдні Рэспубліка Казахстан святкуе свой юбілей — 30 гадоў таму дзяржава атрымала незалежнасць. Напярэдадні Дня Незалежнасці першы прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў адказаў на пытанні газеты «Дзелавы Казахстан». Публікуем скарочаную версію інтэрв'ю.

— Нурсултан Абішавіч, 16 снежня 1991 года быў прыняты Закон «Аб дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Казахстан». Асабіста для вас з чаго пачаўся шлях да дзяржаўнага і эканамічнага суверэнітэту Казахстана?

— Непазбежнасць распаду Савецкага Саюза выцякала з шэрагу падзей, якія адбыліся за апошнія два гады яго існавання. Яны сведчылі аб тым, што цэнтральная ўлада фактычна згубіла кантроль над грамадска-палітычнай сітуацыяй у краіне. Знакавай падзеяй стаў жнівеньскі путч. 23 жніўня 1991 года, пасля няўдалай спробы дзяржпераварoту, я заявіў аб сваім выхадзе з Палітбюро Цэнтральнага камітэта КПСС і саставу Цэнтральнага камітэта КПСС. 7 верасня на надзвычайным з'ездзе кампартыі Казахстана было прынята рашэнне аб утварэнні на яе аснове Сацыялістычнай партыі. Пасля путча дзейнасць кампартыі ў шэрагу рэспублік СССР аказалася пад забаронай. Цэнтральная ўлада пазбавілася апошняга рычага ціску.

1 снежня ў нашай краіне прайшлі першыя ўсенародныя выбары прэзідэнта. Праз некалькі дзён я падпісаў Канстытуцыйны закон «Аб дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Казахстан», які аформіў юрыдычны статус нашай рэспублікі як суверэннай дзяржавы. Практычна адразу ж Казахстан быў прызнаны многімі іншымі дзяржавамі свету як паўнавартасны член сусветнай супольнасці. Наперадзе былі гады ўпартай працы па фарміраванні новай палітычнай, эканамічнай і прававой сістэмы, стварэнні дэмакратычных інстытутаў з улікам міжнароднага вопыту і асаблівасцяў уласнага гістарычнага развіцця.

— У студзені 1992 года з прыняццем указа Прэзідэнта РК «Аб мерах па лібералізацыі цэн» пачалася вельмі балючая рэформа цэнаўтварэння і практычны пераход да рыначнай эканомікі. Які комплекс мер тады рэалізоўваўся ў падтрымку рэформ?

— З-за радыкальнай змены эканамічных адносін з прычыны пераходу да рыначнай сістэмы імгненна ўзнікла вялікая колькасць праблем: гіперінфляцыя, востры дэфіцыт на харчовыя і нехарчовыя тавары, збераджэнні насельніцтва абясцэніліся, і большая частка казахстанцаў апынулася за рысай беднасці. Для таго, каб хоць неяк змякчыць эканамічны ўрон для насельніцтва, быў прыняты шэраг мер, накіраваных на зніжэнне высокай інфляцыі. Так, для сацыяльна важных прадуктаў і паслуг было ўстаноўлена дзяржрэгуляванне цэн і тарыфаў. Таксама былі прадугледжаны датацыі на шырокі спектр спажывецкіх прадуктаў, паслуг і лекаў. Варта адзначыць, што аднамомантная лібералізацыя цэн была першым смелым і вельмі адказным крокам па развіцці эканомікі краіны на шляху да рынку і кардынальнага рашэння вострай харчовай праблемы. Гэта і стала галоўнай часткай радыкальных мер, якія патрабавалася ўводзіць у той сітуацыі. І, як паказаў далейшы ход рэформ і функцыянавання эканомікі, выбар дадзенай стратэгіі быў адзіна правільным.

Канешне, было шмат крытыкі, асабліва ад людзей, якія слепа верылі ў магчымасць захавання былых прынцыпаў размеркавальных адносін і планавага кіравання эканомікай. Аднак я разумеў, што няма шляху назад і што сітуацыя ў эканоміцы стала вынікам разбурэння планавай сістэмы і эканамічных узаемаадносін, якія існавалі ў яе межах. Таму я быў упэўнены, што ўзніклы шок для эканомікі часовы, а меры, якія мы прымалі ў той перыяд, прывядуць да ўмацавання суверэнітэту і стварэння новай, больш эфектыўнай эканамічнай сістэмы.

— У гісторыі Казахстана быў перыяд, калі пасля роспуску парламента ў 1995 годзе вы да фарміравання новага саставу заканадаўчай улады за некалькі месяцаў падпісалі каля сотні ўказаў, якія маюць сілу закона. Па ацэнках прафесійных фінансістаў, гэты пакет законаў забяспечыў прарыў у эканамічнай і фінансавай сферах. Як прымаліся гэтыя ўказы, з кім прапрацоўваліся, што яны далі краіне?

— Гаворка ідзе аб Вярхоўным Савеце XIII склікання, які ажыццяўляў сваю дзейнасць з красавіка 1994 да сакавіка 1995 года. Пасля таго, як Канстытуцыйны суд Казахстана прызнаў неканстытуцыйнасць паўнамоцтваў абраных дэпутатаў Вярхоўнага Савета, юрыдычнай сілы пазбавіліся 314 прынятых імі нарматыўна-прававых актаў. На працягу 10 месяцаў без парламента, а менавіта да студзеня 1996 года, мной было выдадзена 147 указаў, якія мелі сілу канстытуцыйнага або звычайнага законаў. Іх прыняцце, сапраўды, мела прарыўны эфект, паколькі дало магчымасць у кароткія тэрміны вырашыць супярэчнасці, якія выспелі на той момант у эканамічнай і фінансавай сферах.

Натуральна, што ўсе прынятыя заканадаўчыя акты прапрацоўваліся з удзелам усіх членаў урада краіны. Тады кабінет міністраў стаў калегіяльным органам пры прэзідэнце, аператыўным штабам, які працаваў кругласутачна. І, нягледзячы на гэта, усё роўна востра адчуваўся дэфіцыт кваліфікаваных кадраў, здольных думаць па-новаму. Менавіта па гэтай прычыне я быў вымушаны ўзяць на сябе ініцыятыву і адказнасць за будучыню народа Казахстана, аб'яднаўшы пасады кіраўніка дзяржавы і кіраўніка выканаўчай улады. Вынікам гэтага ўсяго стала тое, што краіна атрымала законы, якія адпавядалі сусветным стандартам і якія павярнулі эканоміку краіны ў новае рэчышча.

— У сярэдзіне 90-х гадоў нават не эканоміка, а паўсядзённае жыццё кіравалася ўрадам у ручным рэжыме. Але паралельна ішла сумесная работа прэзідэнта і ўрада па выпрацоўцы эканамічнай палітыкі краіны. Як вызначаліся прыярытэты, першачарговыя напрамкі, прынцыпы фарміравання бюджэту, пытанні фінансавання?

— Ва ўмовах інфляцыі, абсалютнай нявызначанасці ў эканоміцы ў выніку разрыву гаспадарчых сувязяў нам прыйшлося на хаду перабудоўваць эканоміку краіны, змяняць менталітэт людзей. Не было ніякага вопыту. Але мелася разуменне таго, што найважнейшай мэтай з'яўляецца захаванне нашага суверэнітэту. Для гэтага трэба было не толькі пазіцыянаваць Казахстан на міжнароднай арэне як новую незалежную дзяржаву, але і клапаціцца аб грамадска-палітычнай стабільнасці ў краіне, забяспечваць максімальную сацыяльную абароненасць насельніцтва. Усе гэтыя працэсы ішлі паралельна. Нам трэба было, па-першае, усяляк умацоўваць створаную дзяржаўнасць і сістэму дзяржаўнага кіравання. Па-другое, вырашаць праблемы кардынальнага рэфармавання эканомікі і фінансаў, вываду эканомікі з крызісу. Па-трэцяе, выбудоўваць знешнюю палітыку. Па-чацвёртае, забяспечваць унутрыпалітычную стабільнасць.

— Вы асабіста правялі шмат сустрэч з інвестарамі. Такі фармат не з'яўляўся прыкладам агульнай практыкі для кіраўнікоў дзяржаў. Вы ж ішлі на прамы дыялог, у тым ліку стварыўшы Савет інвестараў пры прэзідэнце. Той факт, што Казахстан сярод лідараў па прыцягненні інвестыцый на душу насельніцтва, можна лічыць вынікам такой працы?

— Пасля набыцця незалежнасці Казахстан меў патрэбу ў знешняй падтрымцы, і менавіта прыток замежных інвестыцый дапамог планамернаму развіццю эканомікі краіны і росту дабрабыту народа. Трэба разумець, што замежныя інвестыцыі — гэта не толькі фінансаванне праектаў, але і перадавыя тэхналогіі, а таксама новыя працоўныя месцы.

Сёння Казахстан — лідар па аб'ёме прыцягнутых замежных інвестыцый у Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне. Гэта стала магчымым дзякуючы спрыяльнаму інвестыцыйнаму клімату ў краіне і дзяржаўным мерам падтрымкі інвестараў. Каб падтрымліваць пастаянны прыток інвестыцый з-за мяжы, Казахстан забяспечваў стратэгічных інвестараў адным з самых галоўных крытэрыяў пры выбары краін для інвеставання — палітычная стабільнасць у дзяржаве і камунікаванне праз прамы дыялог з прэзідэнтам і ўрадам.

Савет замежных інвестараў стаў пляцоўкай для разгляду актуальных пытанняў у сферы прыцягнення інвестыцый, удасканалення інстытуцыйнага асяроддзя, рэфармавання судовай сістэмы, павышэння транспарэнтнасці і барацьбы з карупцыяй, прасоўвання экспарту казахстанскай прадукцыі і іншых пытанняў з удзелам прадстаўнікоў улады і кіраўнікоў буйных замежных кампаній. Мэтанакіраваная работа ў гэтым напрамку дазволіла Казахстану прыцягнуць значны аб'ём замежных інвестыцый. Напрыклад, за апошнія 10 гадоў штогадовы прыток інвестыцый у нашу краіну складаў у сярэднім каля $24 млрд. Выключэннямі сталі толькі крызісныя 2015 і 2020 гады.

— Казахстан першапачаткова праводзіў шматвектарную палітыку, у тым ліку і ў эканоміцы. Сёння краіна мае добрыя эканамічныя сувязі з Кітаем, захавала моцныя сувязі з Расіяй, працуе з многімі заходнімі эканомікамі, пры гэтым не сапсаваўшы адносіны ні з адной з краін. Што ляжыць у аснове казахстанскай шматвектарнасці?

— У аснове шматвектарнай палітыкі Казахстана ляжыць развіццё дружалюбных і прадказальных узаемаадносін з усімі дзяржавамі, якія адыгрываюць істотную ролю ў міжнародных справах і прадстаўляюць для нашай краіны практычную цікавасць. Такая пазіцыя Казахстана шмат у чым вызначалася і вызначаецца геапалітычным становішчам нашай краіны, поліэтнічным і шматканфесійным складам насельніцтва, узроўнем развіцця эканомікі ў цэлым. Зыходзячы з усяго гэтага, відавочна, што Казахстан не мае права замыкацца на вузкарэгіянальных праблемах.

Шматвектарнасць, прагматызм і праактыўнасць з'яўляюцца базавымі прынцыпамі знешняй палітыкі нашай рэспублікі і закладзены ў Канцэпцыі знешняй палітыкі Казахстана на 2020—2030 гады, якая зацверджана ўказам прэзідэнта К.-Ж. Такаева ад 6 сакавіка 2020 года. Пры гэтым асноўная ўвага ўдзяляецца ўсялякаму і непарушнаму адстойванню нацыянальных інтарэсаў, канструктыўнаму прасоўванню знешнепалітычных і знешнеэканамічных прыярытэтаў.

— Рэфарматары заўсёды крытыкуюцца. У Казахстане таксама ўсё падвяргалася крытыцы. Вы бачыце ў нейкіх з гэтых рашэнняў памылкі, недахопы ці, магчыма, штосьці даводзілася выпраўляць па ходзе справы?

— Вядомы афарызм сцвярджае: не памыляецца той, хто нічога не робіць. Некаторыя разумныя людзі да гэтай фразы яшчэ дадаюць, што і нічога не рабіць — таксама памылка. Пасля набыцця незалежнасці ў нас не было шмат часу на роздумы і доўгія спрэчкі па тым ці іншым пытанні. Перад намі стаяла выразная стратэгічная мэта — у кароткія тэрміны пабудаваць эфектыўныя эканамічную і фінансавую сістэмы. Усе рашэнні даводзілася прымаць паскорана. Таму цалкам натуральна, што з цягам часу даводзілася ўносіць нейкія карэкціроўкі ў запушчаныя працэсы, мадэрнізаваць ужо зробленае. Вядома, цяжкасці інстытуцыйных змен заўсёды былі і будуць. І тут трэба разумець, што рэформы — гэта змена дзеючых сістэм, часам гэта вельмі маштабныя пераўтварэнні, а ўсё новае заўсёды ўспрымаецца з некаторай асцярогай. Па гэтай прычыне матывы ўзнікнення крытыкі зразумелыя. Ды і калі гэта канструктыўная крытыка, то яна патрэбная і карысная. У цяперашні час мы бачым, што ўсе нашы рэформы, прайшоўшы выпрабаванне часам, працуюць і прыносяць вынікі. Але няма мяжы дасканаласці, таму заўсёды можна знайсці тое, што трэба падкарэктаваць і палепшыць.

— Калі б вам прыйшлося прайсці гэты шлях зноў, ведаючы аб усіх цяжкасцях, вы прайшлі б яго?

— Французскі філосаф Вальтэр сказаў: «Ніколі не бывае вялікіх спраў без вялікіх цяжкасцяў». З ім складана не пагадзіцца. Стварэнне новай суверэннай дзяржавы, фарміраванне ўсіх базавых асноў дзяржаўнасці, вызначэнне ўласнага шляху развіцця і пошук унікальнай нацыянальнай ідэнтычнасці — гэта ўсё вялікія справы, якія патрабуюць тытанічных намаганняў. На гэтым шляху нас натхняла сама мэта, якую сёння Казахстан дасягнуў, — пабудова моцнай незалежнай краіны з сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікай. І, назіраючы сёння за вынікамі ўсіх дасканалых пераўтварэнняў, магу з упэўненасцю адказаць, што я не задумваючыся пагадзіўся б зноў прайсці гэты складаны шлях. Хачу адзначыць, што сёння перад цяперашнім кіраўніком дзяржавы — Касым-Жамартам Такаевым таксама стаяць сур'ёзныя выклікі і важныя задачы. Бо Казахстан працягвае рухацца наперад. Веру, што пры падтрымцы казахстанцаў у яго атрымаецца зрабіць вельмі шмат на карысць развіцця нашай дзяржавы.

АЛЬЯНС НА ТРАІХ

Чаму аб'ядналіся ЗША, Вялікабрытанія і Аўстралія?

Днямі прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і старшыня КНР Сі Цзіньпін у размове выказаліся, што блок AUKUS (ЗША — Вялікабрытанія — Аўстралія) падрывае ядзерную раўнавагу і ўзнімае напружанасць у рэгіёне. Аб гэтым распавёў памочнік прэзідэнта РФ Юрый Ушакоў, паведаміла РІА «Навіны». «Выказвалася заклапочанасць з нагоды актыўнасці амерыканцаў па рэканфігурацыі сітуацыі, якая склалася ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне», — сказаў ён журналістам. Чаму аб'ядналіся ЗША, Вялікабрытанія і Аўстралія, да чаго гэта можа прывесці?

СКАНДАЛЬНЫ КРОК

Лідары ЗША, Вялікабрытаніі і Аўстраліі абвясцілі аб стварэнні альянса AUKUS (названага па першых літарах у назвах гэтых краін на англійскай мове) у сярэдзіне верасня. Было абвешчана, што ў межах гэтага аб'яднання дзяржавы мяркуюць паглыбіць ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, якое адказвае «інтарэсам спрыяння міру і стабільнасці ў Інда-Ціхаакіянскім рэгіёне».

Стварэнне трохбаковага партнёрства было поўнай нечаканасцю, гэта справакавала шырокамаштабны дыпламатычны скандал на міжнародным узроўні — Францыя адклікала сваіх паслоў з ЗША і Аўстраліі. Гэтае рашэнне было прынята на фоне заявы аўстралійскага прэм'ера Скота Морысана, які пасля заключэння новага пакта паведаміў аб тым, што Канбера адмаўляецца ад найбуйнейшага ў яе гісторыі абароннага кантракта з французскай Naval Group на пастаўку 12 падводных лодак класа Attack на суму звыш 50 млрд еўра, нагадала rt.com.

Аўстралія абгрунтавала гэты крок тым, што ў рамках новаўтворанага AUKUS яна павінна атрымаць ад ЗША тэхналогіі будаўніцтва атамных субмарын. Пры гэтым Скот Морысан сцвярджаў, што яго краіна не плануе станавіцца ядзернай дзяржавай. «Жадаю растлумачыць: Аўстралія не імкнецца да валодання ядзернай зброяй або стварэння грамадзянскага ядзернага патэнцыялу. Мы працягнем выконваць усе нашыя абавязацельствы ў сферы нераспаўсюджвання ядзернай зброі», — сцвярджаў аўстралійскі прэм'ер пасля стварэння AUKUS.

Таксама Морысан падкрэсліў, што новыя падлодкі не выклічуць гонку ўзбраенняў і не будуць абсталяваныя ядзернай зброяй. «На працягу многіх гадоў адбываецца ўзмацненне мілітарызацыі Інда-Ціхаакіянскага рэгіёна. Ужо некаторы час мы назіраем актывізацыю дадзенага працэсу. І яна пачалася да прыняцця нашага рашэння», — канстатаваў Морысан. Пры гэтым, па словах прэм'ера, падлодкі неабходны Аўстраліі для таго, каб праецыраваць сваю прысутнасць у стратэгічна важных водах, такіх як Паўднёва-Кітайскае мора. «Аўстралія адарваная ад астатняга свету. Нам неабходныя падлодкі з вялікай далёкасцю плавання, здольныя забяспечыць доступ у стратэгічна важныя воды», — растлумачыў Морысан.

Дэнансацыя маштабнага пагаднення выклікала вельмі негатыўную рэакцыю ў Парыжы. Акрамя адклікання паслоў, цэлы шэраг французскіх палітыкаў заклікалі перагледзець адносіны з ЗША, а некаторыя нават заявілі пра неабходнасць выхаду з НАТА. Кіраўнік МЗС Пятай рэспублікі Жан-Іў Ле Дрыян паказаў на аднабаковасць і непрадказальнасць дзеянняў членаў партнёрства, што недапушчальна ў дачыненні да іншых заходніх саюзнікаў. «Пытанне не толькі ў разрыве кантракта па ўзбраеннях — сапраўды, гэта негатыўны момант для Францыі, — але і ў падрыве даверу паміж саюзнікамі», — сказаў Ле Дрыян падчас прэс-канферэнцыі на палях сесіі Генасамблеі ААН у Нью-Ёрку.

Абвяшчэнне аб стварэнні AUKUS стала нечаканасцю для Еўрасаюза. Афіцыйны прадстаўнік знешнепалітычнай службы ЕС Петэр Стана прызнаў, што Брусель нічога не ведаў адносна планаў ЗША, Вялікабрытаніі і Аўстраліі. «Насамрэч ЕС не быў праінфармаваны аб гэтым праекце або ініцыятыве. Мы будзем абмяркоўваць і ацэньваць гэтае пытанне ўнутры Еўрасаюза з краінамі-членамі», — заявіў Стана. У той жа час афіцыйны прадстаўнік Еўракамісіі Дана Спінант адзначыла, што ЕК устрымаецца ад каментарыяў па стварэнні AUKUS, і дадала, што стварэнне гэтага партнёрства не акажа негатыўнага ўплыву на адносіны ЕС з яго членамі.

ГОНКА ЎЗБРАЕННЯЎ

Эксперты адзначаюць, што стварэнне AUKUS сапраўды можа прывесці да дэстабілізацыі стратэгічнай абстаноўкі ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне з-за перадачы амерыканскіх тэхналогій будаўніцтва атамных падводных лодак (АПЛ) Аўстраліі. Так, прадстаўнікі палітычных колаў у некалькіх ключавых краінах рэгіёна ўжо заявілі, што яны таксама павінны валодаць уласнымі АПЛ. У Японіі з падобным тэзісам выступіў член кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі, экс-міністр абароны краіны Тара Кона. «З пункту гледжання тэхнічных здольнасцяў уладанне атамнымі падводнымі лодкамі вельмі важна», — адзначыў палітык. Яго пазіцыю падтрымала колішні міністр юстыцыі Японіі Санаэ Такаіці. Яна падкрэсліла, што валоданне атамнымі падводнымі лодкамі стане важнай дапамогай для нацыянальнай абароны ў кантэксце росту міжнароднай напружанасці.

Тэму ядзернай бяспекі ўзнялі і ў Індыі. Так, газета Hindustan Times неўзабаве пасля фарміравання новага партнёрства выпусціла матэрыял пад загалоўкам «Ці можна сказаць, што альянс AUKUS — гэта сігнал для Індыі абзавесціся шматмэтавымі атамнымі падводнымі лодкамі?». У артыкуле выказвалася меркаванне аб тым, што надышоў час «перагледзець свой патэнцыял стрымлівання. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што Індыя і Японія разам з ЗША і Аўстраліяй з'яўляюцца ўдзельнікамі іншага рэгіянальнага аб'яднання — так званага чатырохбаковага дыялогу па бяспецы (Quadrilateral Security Dialogue, QUAD), або «чацвёркі».

Пасля стварэння AUKUS былы начальнік штаба ВМС Індыі адмірал Аруна Пракаш заявіў, што індыйскі бок доўгі час дамагаўся ад Вашынгтона перадачы тэхналогій будаўніцтва атамных падлодак. «Доўгія гады ЗША казалі Індыі, што амерыканскія законы робяць немагчымым перадачу тэхналогій, якія датычацца ядзерных сілавых установак, каму-небудзь, нават саюзнікам. Нават інда-амерыканская ядзерная здзелка і падпісанне чатырох асноўных пагадненняў, па ўсёй бачнасці, не мелі ніякага значэння», — сказаў Пракаш.

Японія і Тайвань ужо выказалі сваю безумоўную падтрымку саюзу AUKUS. Ваенны бюджэт Тайваня складае вялікія для маленькай краіны амаль $17 млрд, і на наступны год у яго закладзена праграма коштам у 1,4 мільярда на закупку новых знішчальнікаў. У Японіі не першы год ідуць дыскусіі аб тым, што настаў час ужо адмовіцца ад абмежавання ваенных выдаткаў у 1 % ВУП, усталяванага пасля паражэння ў Другой сусветнай вайне. Пакуль абвешчана аб распрацоўцы гіпергукавых ракет. Паўднёвая Карэя на фоне пастаянных канфліктаў з паўночным суседам рэгулярна павышае свае ваенныя выдаткі — у сярэднім на 7 працэнтаў штогод пачынаючы з 2018-га.

Тым часам газета Financial Times прыводзіць меркаванні экспертаў, якія сцвярджаюць, што са з'яўленнем AUKUS Аўстралія і ЗША будуць надаваць менш значэння «чацвёркі». Так, выданне цытуе крыніцу ва ўрадзе ЗША, які адзначае, што QUAD не разглядаецца ў якасці «арганізацыі рэгіянальнай бяспекі».

Аўстралія стане сёмай краінай у свеце, якая валодае атамнымі падлодкамі. Цяпер найбуйнейшым флотам валодаюць ЗША — 68 субмарын, з якіх 14 прызначаныя (могуць несці) для міжкантынентальных балістычных ракет. У Расіі 29 атамных падлодак (з іх 11 для МБР), у Кітая — 13 (6), у Вялікабрытаніі — 11 (4), у Францыі — 8 (4). У Індыі адна, і яна здольная несці МБР. Па словах ваеннага эксперта, старшага навуковага супрацоўніка НДУ ВШЭ Васіля Кашына, «стварэнне AUKUS — адзін з этапаў расколу ў рэгіёне».

ДА ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ

Між тым у МЗС КНР заявілі, што падобныя дзеянні правакуюць гонку ўзбраенняў у Ціхім акіяне і супярэчаць прынцыпу нераспаўсюджвання ядзернай зброі. «Кітай выказвае вострую заклапочанасць супрацоўніцтвам у сферы стварэння ядзерных субмарын паміж Аўстраліяй, Вялікабрытаніяй і ЗША. Гэта ўзмоцніць трэнні ў рэгіёне, а таксама справакуе гонку ўзбраенняў, створыць пагрозу рэгіянальнаму міру і стабільнасці і падарве міжнародныя намаганні ў сферы нераспаўсюджвання ядзернай зброі», — адзначыў афіцыйны прадстаўнік кітайскага знешнепалітычнага ведамства Чжаа Ліцзянь. Ён дадаў, што, на думку Пекіна, краіны — удзельніцы AUKUS абышлі міжнародныя правілы, заключыўшы адпаведнае пагадненне па атамных падводных лодках.

Эксперты, у сваю чаргу, называюць занепакоенасць РФ і КНР наконт альянсу AUKUS цалкам абгрунтаванай. Як заўважыў rt.com загадчык кафедры міжнародных арганізацый і сусветных палітычных працэсаў факультэта сусветнай палітыкі МДУ Андрэй Сідараў, «мэты гэтай арганізацыі непразрыстыя». З яго пункту гледжання, фармулёўкі, з якімі быў сфарміраваны AUKUS, з'яўляюцца «вельмі размытымі» з пункту гледжання міжнароднага права і пратакола адносін паміж дзяржавамі. «Гэты фармат сур'ёзна адрозніваецца ад прынятых формаў міжнародных арганізацый, у тым ліку вайскоўцаў. Адсутнічае статут, арганізацыйная структура, выразныя абавязацельствы бакоў. Гэта сведчыць аб тым, што, калі геапалітычная абстаноўка зменіцца, мэты і задачы AUKUS могуць быць аператыўна перафарматаваны», — растлумачыў эксперт. На яго думку, пры дапамозе альянсу ЗША, Аўстралія і Вялікабрытанія ствараюць новы геапалітычны контур вакол Кітая і Расіі. «Стратэгія калектыўнага Захаду на чале з ЗША накіравана на аднаўленне структуры халоднай вайны», — лічыць Сідараў.

Прафесар факультэта права расійскай Вышэйшай школы эканомікі Аляксандр Домрын са свайго боку падкрэсліў, што Аўстралія не здолела вызначыць выразную пазіцыю па адрасаваных ёй пытаннях на пасяджэнні МАГАТЭ, бо не з'яўляецца вядучым партнёрам у альянсе. «Аўстралія не з'яўляецца ініцыятарам стварэння AUKUS, адпаведна, яна не магла дастаткова перакананаўча пракаментаваць прычыны стварэння гэтай арганізацыі. Усе пытанні павінны быць накіраваныя ЗША, якім гэтая структура патрэбна перш за ўсё для супрацьстаяння КНР», — адзначыў Домрын. Ён таксама не лічыць дастаткова перакананаўчымі запэўненні аўстралійскіх улад адносна ядзернага патэнцыялу краіны. «Я б не стаў даваць заявам аўстралійскага прэм'ера. Згодна з прадстаўленымі планамі, Канбера пабудуе атамныя падводныя лодкі толькі да 2027 года. І не вельмі зразумела, якім стане AUKUS да гэтага моманту», — заўважыў эксперт.

Як адзначаюць эксперты, Аўстралія стане сёмай краінай у свеце, якая валодае атамнымі падлодкамі. Цяпер найбуйнейшым флотам валодаюць ЗША — 68 субмарын, з якіх 14 прызначаныя (могуць несці) для міжкантынентальных балістычных ракет. У Расіі 29 атамных падлодак (з іх 11 для МБР), у Кітая — 13 (6), у Вялікабрытаніі — 11 (4), у Францыі — 8 (4). У Індыі адна, і яна здольная несці МБР. Па словах ваеннага эксперта, старшага навуковага супрацоўніка НДУ ВШЭ Васіля Кашына, «стварэнне AUKUS — адзін з этапаў расколу ў рэгіёне». Са з'яўленнем новага «абарончага» альянсу Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён насамрэч становіцца новай глабальнай «гарачай» кропкай кшталту Блізкага Усходу. Разгортванне на гэтай сусветнай платформе (задзейнічаны тры кантыненты) гонкі ўзбраенняў і наяўнасць ядзернага ўзбраення надаюць сітуацыі трывожную вастрыню.

Захар БУРАК.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Авиакомпания «Белавиа», г. Минск, ул. Немига, 14а**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов:

ДВИГАТЕЛЬ CF 34-3A1, s/n 807573, инв. № 050500491.

Начальная цена (с НДС 20 %)*: **245 700,00 бел. руб.**
Шаг аукциона: **2 %** от текущей цены.
Местонахождение: РУП «Национальный аэропорт Минск»

**Цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС либо по согласованию с продавцом с нулевой ставкой НДС при экспорте товаров в государства-члены ЕАЭС. В случае оплаты победителем электронных торгов либо единственным участником электронных торгов, согласившимся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – покупатель) по договору купли-продажи стоимости предмета торгов в иностранной валюте (в случаях, разрешенных законодательством Республики Беларусь), цена продажи предмета электронных торгов рассчитывается по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения электронных торгов*

Задаток 5 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами Республики Беларусь задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390.
В случае если покупателем станет нерезидент Республики Беларусь, денежный эквивалент суммы задатка в белорусских рублях перечисляется на расчетный счет продавца и учитывается при окончательном расчете с ним

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания покупателю. Продавец вправе отказаться от подписания договора купли-продажи в случае, если покупателем по результатам аукциона будет определена организация или физическое лицо, в отношении которых применены и действуют международные санкции со стороны ЕС и США, или причастные к террористической и (или) экстремистской деятельности. В таком случае результаты торгов аннулируются организатором аукциона по заявлению продавца, задаток участника аукциона, вознаграждение и затраты организатора аукциона возврату не подлежат

Условия оплаты предмета электронных торгов: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность об иных сроках и порядке оплаты предмета электронных торгов, оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **15 рабочих дней** после подписания договора купли-продажи; **поставка предмета аукциона** в течение **5 рабочих дней** после 100 % оплаты

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также более подробную информацию о предмете электронных торгов, о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену.
Бывшее в употреблении имущество. Работоспособность ДВС, узлов и агрегатов не проверялась. При инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по вывозу предмета аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 1 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов, продавец имеют право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.10.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
29.12.2021 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **27.12.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Торфопредприятие Глинка» (Продавец)

ЛОТ № 1: АВТОВЕСОВАЯ,

инв. № 135/С-14578, 141 кв. м, Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2/3.

Земельный участок 125885201601000115, 2,6560 га.
Начальная цена с НДС – 16 054,21 руб. Задаток – 1 605,42 руб.
Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 5 000,00 руб.

Аукцион состоится 04.01.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 30.12.2021 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 29 декабря 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % (лоты №№ 5, 6); на 20 % (лоты №№ 9, 10); на 30 % (лот № 7); на 40 % (лоты №№ 1, 2, 3, 4, 8) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства (лот № 4) (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лот № 1)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца		
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-38828** общей площадью **1 745,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания помещений ГПК** (составные части и принадлежности: Б-Автодороги, въезды с бетонным покрытием, А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, В-Дорожки и площадки). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа». **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100001004545** общей площадью **0,4976 га** – для строительства и обслуживания домика дежурного с благоустройством (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения). **Право аренды (доля в праве 307/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/25, участок № 2	**53 136,00**	5 313,60
2	**Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42733	**21 960,00**	2 196,00
3	**Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42734	**21 960,00**	2 196,00
4	**Автомобиль ZAZ LANOS, 2010 г. в., рег. № 9533 ВТ-3** , цвет – темно-бордовый металлик, тип ТС – легковой седан, № кузова (рамы) Y6DTF69Y090224536, пробег – 221 637 км, состояние – на ходу	**3 600,00**	360,00
5	**Станок горизонтальный консольно-фрезерный НГФ-110Ш3,** инв. № 142-41819, год выпуска 1980	**1 296,00**	129,60
6	**Станок вертикально-сверлильный 2Н135,** инв. № 142-41131, год выпуска 1978	**2 484,00**	248,40
7	**Реактор для приема латекса (в количестве 6 ед.),** инв. №№ 142-4122-2.2, 142-4123-2.2, 142-4124-2.2, 142-4125-2.2, 142-4126-2.2, 142-4172	**68 544,00**	6 854,40
8	**Лифт грузовой № 800779,** инв. № 150-5285, г/п 500 кг., год выпуска 2001	**7 128,00**	712,80
9	**Блочная турбогенераторная установка с противодавлением пара «Кубань 0,5 ПАЗ»,** инв. № 141-5094, год выпуска 1997	**107 464,76**	10 746,48
10	**Блочная турбогенераторная установка с противодавлением пара «Кубань 0,75 ПАЗ»,** инв. № 141-5087, год выпуска 1999	**126 490,10**	12 649,01

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (044) 797-88-07 – заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

